РАЁНЫ, УКЛЮЧАЙЦЕСЯ Ў КОНКУРС

на лепшае правядзеньне масавай сяўбы

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 125 (4029)
АЎТОРАК, 12 МАЯ 1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАЛЫННА

Забясьпечыць выкананьне фінпляну другога кварталу

Другі квартал трэцяга рашаючага году зьяўляецца пэрыядам бурнага разгортваньня будаўніцтва, вялізарных укладаньняў ва ўсе галіны народнай гаспадаркі, узмоцненага фінансаваньня другой бальшавіцкай вясны і кантрактацыі. Гэта робіць асабліва АДКАЗНАЙ задачу выкананьня фінпляну другога кварталу.

У выніку вялікай напружанай работы партыйных арганізацый, савецкага апарату, савецка-партыйнага друку, амаль усе арганізацыі ўсьвядомілі тое палажэньне, што ФІНАНСАВАЯ РАБОТА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ВАЖНЕЙШАЙ ЧАСТКАЙ УСЁЙ РАБОТЫ ПА ВЫКАНАНЬНІ ПЯЦІГОДКІ ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ, ШТО НЕПАРЫЎНАЯ, ЦЕСНАЯ СУВЯЗЬ ІСНУЕ ПАМІЖ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕМ НАРОДНАГАСПАДАРЧЫХ І ФІНАНСАВЫХ ПЛЯНАЎ.

Аднак, дасягнуты пэрапом яшчэ не забясьпечыў НАРАСТАНЬНЯ ТЭМПАЎ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ у адпаведнасьці з няўхільным разгортваньнем сацыялістычнага будаўніцтва. Яшчэ канчаткова не ліквідаваны апартуністычны курс на сэкацёк і дэмабілізацыйныя настрої, якія мелі месца ў першым квартале г. г. у радзе раёнаў.

Яшчэ дае адчуваць сябе апартуністычная недаацэнка фінработы, няўменьне мабілізаваць грамадзкасьць вакол выкананьня фінпляну, курс на «чарговасьць кампаній» і, нарэшце, простае ігнараваньне дырэктыў партыі і ўраду. Фінансава-крэдытны апарат у радзе раёнаў (Гарадоцкі, Юравіцкі і інш.) праявіў дэмабілізацыйныя настрої — «дзесьці, хтосьці за нас зробіць»—і ўпусьціў лепшы час для работы — пачатак кварталу.

У выніку, напружаны фінплян другога кварталу па БССР выкананы за красавік толькі на 22,1 проц., а месячны плян —на 46,4 проц. Капл 8 МЛН. РУБ. не паступіла ў дзяржаўныя касы на справу фінансаваньня сацыялістычнага будаўніцтва.

Амаль 70 проц. фінпляну другога кварталу складаюць ДОБРААХВОТНЫЯ ПЛАЦЯЖЫ. Сыстэматычнае і няўхільнае ажыцьцяўленьне палітыкі партыі і ўраду па зьмяншэньні падатку, які прыпадае на працоўнае насельніцтва гораду і вёскі, прывяло да бязупыннага росту з кварталу ў квартал удзельнай вагі добраахвотных плацяжоў у фінпляне. Гэта акалічнасьць патрабуе КАРЭННАЙ ПЕРАБУДОВЫ ЎСЁЙ РАБОТЫ ФІНАНСАВА-КРЭДЫТНАЙ СЫСТЭМЫ. Асабліва шкодныя зьяўляюцца зараз погляды на фінапарат, як на выключна фіскальны орган, як на фінработніка, як на «фінінспэктара». Гэтыя погляды прыводзяць цяпер да ЗАМЫКАНЬНЯ ФІНРАБОТЫ Ў РАМКАХ ГАБІНЭТАЎ, да бюракратызацыі справы, да падмены масавай работы цыркулярШчынай і адміністраваньнем.

УЗЯЦЬ РАШУЧЫ КУРС НА МАСАВАСЬЦЬ РАБОТЫ, НА ЦЕСНУЮ СУВЯЗЬ З АКТЫВАМ ЗАВОДАЎ, КАЛГАСАЎ, САУГАСАЎ, ВЁСАК, ВЫВЕСЬЦІ ФІНРАБОТУ ЗА МЕЖЫ ГАБІНЭТАЎ, УІ ДАРАНІЦЬ У РАБОТУ МЭТАДЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ — САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА, ГРАМАДЗКІ БУКСІР, СУСТРЭЧНЫЯ ПЛЯНЫ — гэта галавная задачы фінансава-крэдытнага апарату. Трэба зразумець, што без разгортваньня масавай работы вакол фінпляну, без уцягненьня рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў, фінансава-крэдытны апарат ні ў якім разе ня зможа стварыцца з адказнымі задачамі мабілізацыі сродкаў.

Мясцовыя арганізацыі павінны лічыць садзейнасьць фінансавай рабоце адной са сваіх адказных задач. Факты, аднак, гавораць, што ў радзе раёнаў БССР патрэбнай садзейнасьці, патрэбнай увагі няма. Ня спыняюцца, ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы, перакідваньні фінработнікаў на розныя кампаніі, агапсньне фінансавага вучастку, пастаноўка кампаній «у чаргу». Большасьць фінансава-крэдытных органаў вядзе работу без прыцягненьня грамадзкасьці. Яскравы прыклад. Нядаўна, у часе редыё-перакліч 22 гарадоў наконт мабілізацыі сордкаў, тыфліскі гарфа выклікаў менскі на сацспаборніцтва. МЕНСКІ гарфінаддзел праводзіць сваёасаблівую «змову маўчаньня», не адказваючы на выклік.

У выніку такой работы — прарывы ў мабілізацыі сродкаў, пагроза выкананьню фінпляну трэцяга рашаючага.

Возьмем такі адказны вучастак, як РЭАЛІЗАЦЫЯ ПАЗЫКІ «ПЯЦІГОДКА ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ». Па БССР на ВЁСЦЫ рэалізавана толькі 55 проц. заданьня. У касы дзяржбанку недапаступіла за мінулы квартал 3 МЛН. 600 ТЫС. рублёў узносаў па пазыцы, вызначаных пляням. Фінорганы і камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту не адучыліся яшчэ ад погляду, што «КАМПАНІЯ РЭАЛІЗАЦЫІ СКОНЧАНА». Пэрыяд першага тыражу пазыкі «Пяцігодка» ня быў скарыстан для АКТЫВІЗАЦЫІ кампаніі, для таго, каб кожны выйгрыш даў новыя кадры падпісчыкаў. Не ліквідаваны спробы замены масавай работы адміністрацыйным навязваньнем аблігацый, што падрывае давер'е мас бядняцка-сераднякцкага сялянства да дзяржкрэдыту (факт значнага навязваньня аблігацый нядаўна меў месца ў ЖГУНСКІМ сельсавеце, ГОМЕЛЬСКАГА раёну). Ня выканана дырэктыва СНК аб арганізацыі пры камісіях садзейнасьці інстытуту грамадзкіх інструктароў з актывістаў. ЦЕРАХАЎСКІ-Ж і ЛЕЛЬЧЫЦКІ райвыканкомы забаранілі нават арганізацыю такога інстытуту, спасылаючыся на «пасеўную кампанію».

НА БАЗЕ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ДРУГОГА ТЫРАЖУ ПАЗЫКІ «ПЯЦІГОДКА», ЯКІ АДБУДЗЕЦЦА 25 МАЯ, ТРЭБА ДАБІЦЦА НОВАГА МОЦНАГА ЎЗДЫМУ ПАДПІСКІ, ЗЬВЯРНУЎШЫ АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ НА САМЫ СЛАБЫ ВУЧАСТАК — ВЁСКУ.

АШЧАДКАСЫ БССР у красавіку ня толькі не ліквідавалі прарываў у выкананьні фінпляну, але, наадварот, пагпыбілі іх, выканаўшы толькі 34,5 ПРОЦ. месячнага пляну. Уся бяда ў тым, што работа ашчадкас не перабудавана, што работнікі кас «адседжваюцца ля законца», ня ідуць у масы, каб прапагандаваць ашчадсправу. Лепшы вопыт ЛЕНІНГРАДСКАГА ЗАВОДУ ІМЯ К. МАРКСА, ЗАВОДУ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, ВЫДАВЕЦТВА «ЗЬВЯЗДЫ» (Менск), дзе ашчадкаса даведзена да варштату, дзе безнаяўныя разьлікі пусьціці глыбокія карэньні, дзе ашчадкасай ахоплены амаль усе 100 проц. работнікаў, — не папулярызован сярод шырокіх мас.

Ня выканан плян давядзеньня ашчадкас да вёсак і калгасаў. На працягу першага кварталу і красавіка трэба было адкрыць 195 новых кас, Плян выканан толькі на 24 проц.

Ашчадапарат, каб ажыцьцявіць ускладзеныя на яго баявыя задачы, павінен перавесьці сваю работу на рэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, згуртаваць вакол ашчадкай справы шырокі актыў з грамадзкіх інструктароў, членаў камісій садзейнічаньня, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў.

Наша ПАДАТКОВАЯ ПАЛІТЫКА мае выразны клясавы характар і сваім пёзам накіравана супроць капіталістычных элемэнтаў. Клясавая барацьба вакол абавязковых плацяжоў разгортваецца асабліва востра. Кулацка-нэпманскія элемэнты супраціўляюцца нашым фінансавым мерапрыемствам, якія дапамагаюць ажыцьцяўляць лінію партыі на выкарчоўваньне рэштак капіталістычных элемэнтаў. Таму ў падатковай работе асабліва значэньне набывае ЗГУРТАВАНЬНЕ МАС РАБОЧЫХ, КАЛГАСЬНІКАЎ, БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ ДЛЯ НАСТУПЛЕНЬНЯ НА КАПІТАЛІСТЫЧНЫЯ ЭЛЕМЭНТЫ, для канчатковай ліквідацыі кулацкага сабатажу. Аднак, правапартуністычная бязьдзейнасьць, дрэнае выяўленьне кулацкіх гаспадарак для індывідуальнага абкладаньня, «левыя» перагібы пры абкладаньні, патураньне клясава-варожым элемэнтам, што мелі месца ў радзе раёнаў, прывялі да прарываў у выкананьні пляну АБАВЯЗКОВЫХ ПЛАЦЯЖОЎ.

Толькі 26 раёнаў поўнасьцю спагналі індывідуальнае абкладаньне, а 7 раёнаў культзбор з кулакоў. У ВУЗЬДЗЕНСКІМ раёне дагэтуль спагнана з кулакоў толькі 26 проц. індывідуальнага абкладаньня па с.-г. падатку, у ЛОЕЎСКІМ—35,7 проц., ЛЁЗЬНЕНСКІ раён спагнаў з кулацкіх гаспадарак ня больш ня менш, як... 1,6 проц. пляну па культзборы. ГАРАДОЦКІ — 2,9 проц., ЧЫРВОНАСЛАБОДЗКІ — 15 проц. і г.д.

Блізкійшыя задачы ў галіне спагнаньня абавязковых плацяжоў — РАШУЧА ЗЛАМАЦЬ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ КУЛАЦТВА, ПОЎНАСЦЮ СПАГНАЦЬ УСЕ ПЛАЦЯЖЫ, УДАРЫЦЬ ПА КУЛАЦКІХ АБАРОНЦАХ.

Вялікае значэньне набывае зараз падрыхтоўка да правядзеньня с.-г. падатку, шырокая папулярызацыя закону аб сель гаспадатку — магутнай зброі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, падрыхтоўка да ўліку аб'ектаў абкладаньня.

Вялізарную ролю ў выкананьні фінпляну адыгрывае НОВАЯ СЫСТЭМА КРЭДЫТАВАНЬНЯ, уведзеная з 1 мая, якая дае магчымасьць праводзіць пільны кантроль рублём гаспадарчай работы, якая стымулюе сацыялістычнае накапленьне, гаспадарчы разрахунак і суровую эканомію. Першыя дні новай сыстэмы паказалі, што большасьць гаспадарчых арганізацый не падрыхтаваліся да новых умоў работы, што тэрмін са дня выданьня пастановы СНК — 14 сакавіка — ня быў скарыстан для правядзеньня дагаворнай кампаніі. Дагэтуль не заключана шмат дагавароў. Многія гаспадарчыя арганізацыі рознымі агаворачкамі і ўмоўнасьцямі ў дагаварох імкнуцца скінуць з сябе адказнасьць за расхлябанасьць, за безгаспадарчасьць. Дзяржбанк ужо закрыў крэдыты раду арганізацый, рашуча ўдарыўшы рублём па недысцыплінаванасьці, бездапазнасьці і апартуністычных тэмпах. Суровы кантроль рублём павінен паказаць, што прынцып «НЯМА ДАГАВОРУ — НЯМА КРЭДЫТУ» — ня пусты гук, а рэальны факт. Работа кожнай арганізацыі павінна расцэньвацца па яе ўменьні мабілізоўваць сродкі на справу сацыялістычнага будаўніцтва.

Савецкае Закаўказьзе паказала прыклад бальшавіцкай работы, выканаўшы фінплян першага кварталу. Гэта дасягнута, дзякуючы разгортваньню глыбокай масавай работы вакол мабілізацыі сродкаў, бязьлітаснай барацьбе з апартуністамі ў фінрабоце, рашучаму націску на кулака.

БССР павінна пасьледаваць прыкладу Савецкага Закаўказьля.

Поўнае выкананьне фінпляну другога кварталу павінна быць поўнасьцю забясьпечана.

Арганізуйце сацыялістычнае спаборніцтва паміж калгасамі, саўгасамі і МТС

Ніводнага не засеянага гэктара зямлі. Перавод усіх калгасаў на зьдзельшчыну, арганізацыя магутнага калгаснага прылізу, вырашэньне задач жывёлагадоўлі і тэхкультур—асноўныя паказальнікі для атрыманьня ганаровых сьцягаў

НА ШТУРМ ВЫШЫНЬ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ

Сваячасовае выкананьне пляну веснавой пасеўнай кампаніі мае рашаючае значэньне для выкананьня ўсяго гаспадарчага пляну ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі. Зацяжная зіма скараціла тэрміны сяўбы. Пасьпяховае правядзеньне пасеўнай кампаніі магчыма толькі пры ўмовах максымальнага намаганьня сіл і мабілізацыі ўвагі ўсёй савецкай грамадзкасьці вёскі вакол задач пасеўнай кампаніі. Гэтыя задачы будуць вырашаны, калі работа калгасаў, саўгасаў, МТС і ўсіх раённых арганізацый будзе прасякнута мэтадамі сацыялістычнага спаборніцтва, калі ўдарніцтва ў калгасах, саўгасах і МТС ператворыцца ў магутны рух мас за бальшавіцкія тэмпы і якасьць работы.

Надрукаваная пастанова ЦК КП(б)Б аб арганізацыі агляду ходу сяўбы і разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва набывае асаблівае значэньне. Пастанова ЦК павінна атрымаць гарачы водгук сярод калгасьнікаў, рабочых МТС, саўгасаў і бядняцка-сераднякіх мас вёскі. Задача раённых партыйна-савецкіх арганізацый і НІЗАВОГА ДРУКУ ператварыць агляд у баявы штурм вышынь другой бальшавіцкай вясны, мабілізаваць увагу калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіх мас вёскі на выкананьне задач, якія стаяць у часе сяўбы, арганізаваць шырокае спаборніцтва паміж раёнамі, калгасамі, саўгасамі, МТС і вёскамі.

Шырока папулярызуючы пастановы VI зьезду саветаў, III зьезд калгасаў БССР, закону аб сельгаспадатку і гістарычную адозву партыі і ўраду аб кантрактацыі сярод мас вёскі, арганізацыі павінны змагацца за максымальна-скарочаныя тэрміны сяўбы.

Ніводнага незасеянага га зямлі Поўнае выкананьне плянаў кантрактацыі! Шырокім укараненьнем зьдзельшчыны і на яе аснове дабіцца стала штодзённым мэтадам работы ўсіх калгасаў. Барацьба за вырашэньне праблем жывёлагадоўлі, тэхкультур, стварэньне кармавой базы, барацьба за арганізацыю калгаснага прылізу—вось баявыя задачы агляду, якія павінны быць ажыцьцёўлены.

Дабіваючыся пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы, шырокім разгортваньнем масавай работы сярод бядняцка-сераднякіх мас вёскі выканаем поўнасьцю пляны калектывізацыі. Ажыцьцяўленьне паказаных задач зьявіцца руйнуючым ударам па кулаку і яго агентуры—апартуністам усіх масьцей. Пасьпяховае правядзеньне агляду зьяўляецца важнейшай задачай усіх раённых партарганізацый.

Аб разгортваньні сацспаборніцтва ў сувязі з веснавой сяўбой

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. Даручыць агітмасаваму аддзелу, Культпропу і газэце «Зьвязда» з 10 мая арганізаваць агляд разгортваньня сяўбы і сацспаборніцтва ў сувязі з веснавой сяўбой паміж калгасамі, саўгасамі, раёнамі, МТС і ўнутры калгасаў, саўгасаў і МТС, а таксама паміж раённымі газэтамі на правядзеньне лепшай работы па арганізацыі мас вакол пасеўкампаніі.

2. Устанавіць пераходныя сьцягі імя: ЦК КП(б)Б, ЦВК, Калгасцэнтру, ЦСПСБ, цэнтральных газэт: «Зьвязда», «Савецкая Беларусь», «Рабочий», «Чырвоная зьмена», «Анцябр», «Калгасьнік Беларусі», «Орка» і паасобных прафсаюзаў, а таксама арганізаваць прэміяваньне—лепшых ударнікаў, паасобных ударных калгасных і саўгасных брыгад, калгасаў, саўгасаў, МТС і раёнаў, правёўшых найбольш арганізавана, пасьпяхова і ў максымальна скарочаны тэрмін веснавую сяўбу.

3. Для кіраўніцтва аглядам стварыць штаб у складзе: прадстаўнікоў НКЗБ, Калгасцэнтру, ЦКК, газэт «Зьвязда», «Савецкая Беларусь», «Чырвоная зьмена», «Калгасьнік Беларусі», ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ, агітмасавага аддзелу і Культпропу ЦК.

Умовы конкурсу

Конкурс на лепшае правядзеньне агляду ходу сяўбы і арганізацыі спаборніцтва ў мэтах сваячасовага і поўнага выкананьня плянаў па засеве яравога кліну праводзіцца паміж раёнамі, МТС, саўгасамі, калгасамі і раённымі газэтамі. Асноўнымі паказчыкамі конкурсу зьяўляюцца:

1. Выкананьне поўнасьцю і ў вызначаны тэрмін плянаў сяўбы.

2. Найбольш поўнае выкананьне аграмерапрыемстваў, накіраваных на павышэньне ўраджайнасьці (ачыстка насеньня, пасеў гатунковым насеньнем, радавы пасеў, выкананьне пляну тарфаваньня і вапнаваньня, зьнішчэньне сарнякоў і інш.).

3. Стварэньне кармавой базы (выкананьне пляну сяўбы траў, коральплодаў і сіласных культур, палепшэньне сенажаці і падрыхтоўка да сіласаваньня).

4. Правільная арганізацыя працы і пераход на зьдзельшчыну, а ў саўгасах і МТС—на зьдзельшчыну і гаспадарчы разрахунак.

5. Разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва (заключэньне сацдагавораў паміж паасобнымі брыгадамі, калгасамі, МТС, саўгасамі і раёну з раёнам і арганізацыя грамадзкага кантролю за выкананьнем дагавораў, максымальны ахоп ударніцтвам, арганізацыя грамадзкага буксіру над адстаючымі калгасамі, саўгасамі, МТС і раёнамі ў цэлым і г. д.).

6. Выкананьне плянаў кантрактацыі.

7. Выкананьне заданьняў па спэцыялізацыі раёнаў і паасобных саўгасаў і калгасаў.

8. На аснове ўдарнага правядзеньня сяўбы, правільнай арганізацыі працы і пастаноўкі масавай работы сярод аднаасобнікаў дабіцца максымальнага прыліву ў калгасы, кіруючыся ўстаноўкай, што ў часе веснавой сяўбы павінна быць аб'яднана ў калгасы ў раёнах дзейнасьці МТС ня менш **50 проц.** і ў астатніх раёнах—**30 проц.** паўнасьці ўсіх бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

Акрамя гэтых агульных патрабаваньняў, неабходна дабіцца.

Па МТС

а) ліквідацыі абязьлічкі; б) максымальнай нагрузкі на трактар пры 21-гадзінным рабочым дні ў суткі, захоўваючы шляхам патрэбнага догляду трактара, яго спраўнасьць; в) максымальнай эканоміі гаручага; г) дакладнага выкананьня дараваро ў, заключаных з калгасамі.

Па калгасах і саўгасах

а) найбольшай выпрацоўкі ў часе ворыва і севу на адзінку цягавай сілы пры захаваньні поўнай працаздольнасьці яе; б) рацыянальнага скарыстаньня с.-г. інвэнтару, транспарту і зброі; в) арганізацыі ўзаемнай дапамогі паміж калгасамі, саўгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі; г) больш поўнага культурна-бытавога абслугоўваньня ў часе сяўбы рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і акружаючых бядняцка-сераднякіх гаспадарак (ясьлі, пляцоўкі, сады, грамадзкае харчаваньне ў калгасах і саўгасах).

Па калгасах

лепшага арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў, поўнага абагуленьня сродкаў вытворчасьці (згодна статуту) і стварэньня непадзельных капіталаў.

Раённаму друку

а) найлепшага асьвятленьня ходу сяўбы з завастрэньнем увагі на галоўных вучастках работы свайго раёну; б) арганізацыі масавай работы, якая спрыяе разгортваньню сацспаборніцтва і пасьпяховаму правядзеньню сяўбы.

Прафсаюзным арганізацыям раёнаў

а) арганізацыі дапамогі калгасам у разгортваньні сацспаборніцтва; б) лепшай пастаноўкі масавай работы з членамі прафсаюзаў над лёзунгам — член прафсаюзу — застрэльшчык калектывізацыі; в) арганізацыі непасрэднай дапамогі ў правядзеньні сяўбы, выкарыстоўваючы выхадныя дні, асабліва арганізацыі грамадзкага кантролю і дапамогі прыгарадным гаспадаркам.

Для кіраўніцтва аглядам у раёнах ствараюцца штабы з прадстаўнікоў РК КП(б)Б, РВК, райкалгассаюзу, райпрафбюро, РК ЛКСМ, раённай газэты і райКК-РСІ.

Пры цэнтральным штабе, акрамя ўстанаўленьня пераходных сьцягаў згодна пастановы сакратарыяту, ствараецца прэміяльны фонд, забясьпечваючы прэміяваньне лепшых калгасаў, саўгасаў і раёнаў, пасьпяхова скончыўшых сяўбу і раённых газэт, лепш арганізаваўшых спаборніцтва.

Штаб агляду.



Новая дзевяцігодка ў Віцебску

ЗЬВЕРСТВЫ ПОЛЬСКАЙ ПАЛІЦЭЙШЧЫНЫ НА АКУПАВАНЫХ Зах. Беларусі і Зах. Украіне

Фашысты арганізуюць новыя карныя экспэдыцыі

Што сталася з арыштаванымі ў Сьвенцянскім павеце?

На старонках нашай прэсы паведамлялася ўжо аб бомбах, кінутых на ст. Падбродзьдзе (Сьвенцянскі павет, Віленскае ваяводзтва) і надзвычай падазроным характары самога гэтага замаху.

Самы гэты факт быў шырока выкарыстаны фашысцкай прэсай для разгортваньня асьцервянелай кампаніі супроць усяго рэвалюцыйнага руху працоўных Зах. Беларусі і іх правадыра—Камуністычнай партыі. Фашысцкія газэты высунулі выразна правакацыйную, інсьпіраваную дэфэнзывай версыю аб тым, што нібы КПЗБ зьяўляецца «арганізатарам гэтага замаху». Газэты пачалі друкаваць правакацыйныя выдумкі аб «тайных распараджэньнях ЦК КПЗБ» і іншыя рэчы, сфабрыкаваныя ў габінэтах міністэрства ўнутраных спраў.

Мэта гэтай правакацыйнай кампаніі ясная. Польскі фашызм, падрыхтоўваючыся да вайны супроць СССР, ідзе на самыя тонкія і самыя жорсткія мэтады белага тэрору, якія мяжуюцца з мэтадамі грамадзянскай вайны, для таго, каб зьнішчыць рэвалюцыйны рух мас. Польскі фашызм, расчышчаючы шлях да новых ваенных авантур, імкнецца ФІЗЫЧНА ЗЬНІШЧЫЦЬ КАМУНІСТЫЧНЫ АВАНГАРД РАБОЧАЕ КЛЯСЫ І ПРАЦОЎНАГА СЯЛЯНСТВА.

Гэта кампанія зусім адкрытай правакацыі ня толькі падрыхтоўвае глебу для новай «пацыфікацыі», для новых карных экспэдыцый, накшталт тых, якія пракаціліся вогненай павінай па Зах. Украіне увосень мінулага году. Гэта кампанія, па сутнасьці, прыкрывае ЎЖО РАСПАЧАТУЮ «ПАЦЫФІКАЦЫЮ», РАСПАЧАТЫЯ НОВЫЯ КАРНЫЯ ЭКСПЭДЫЦЫІ—у масавых разьмерах, якія па сваёй жорсткасьці перавышаюць усё, што было да гэтага часу.

Адным з яскравых довадаў гэтага факту зьяўляюцца тыя масавыя арышты, якія зараз-жа адбыліся, пасьля бомбы ў Падбродзьдзі, ва ўсім Сьвенцянскім павеце. Паводле вестак віленскай фашысцкай прэсы, было арыштавана каля 100 чал. у пераважнай большасьці — рабочых і сялян. Гэтым арыштаваным дэфэнзыва правакацыйна прад'явіла абвінавачваньне ва ўкосным ці простым суўдзеле ў замаху на Падбродзьдзе.

Паведаміўшы аб гэтых масавых арыштах, паведаміўшы аб тым, што Віленская палітычная паліцыя пачала сьледзтва па справе арыштаваных, прэса больш ня ўспамінае аб пёсе гэтых, схопленых фашысцкімі апрычнікамі, рабочых і сялянах.

Мы добра ведаем, што адбываецца ў засьценках польскай дэфэнзывы, калі ў яе рукі трапляюць рабочыя і сяляне. Працоўным масам добра вядомы факты разбойніцкіх зьдзекаў і катаваньняў у ЛУЦКАЙ, КОБРЫНСКАЙ, ЛІДЗКАЙ ДЭФЭНЗЫВАХ. Працоўныя добра ведаюць аб зьверскіх катаваньнях распаленым жалезам, аб уліваньні вады праз нос, аб шпільках, якія заганяюцца пад пазногці арыштаваных і г. д. і ўсё для таго, каб прымусіць падпісаць ПРАВАКАЦЫЙНЫЯ І СКЛАДЗЕНЫЯ АГЕНТАМІ ДЭФЭНЗЫВЫ ПРАТАКОЛЫ ДОПЫТАЎ. Мы ведаем ні адзін дзесятак судоў, складзеных на аснове такіх пратаколаў, што НАПІСАНЫ КРЫВЁЮ ЗЬБІТЫХ І КАТАВАНЫХ АХВЯР ДЭФЭНЗЫВЫ.

ТОЕ-Ж САМАЕ АДБЫВАЕЦЦА І З АРЫШТАВАНЫМІ РАБОЧЫМІ І СЯЛЯНАМІ Ў СЬВЕНЦЯНСКІМ ПАВЕЦЕ. Арганізуючы ўсё новыя і новыя правакацыі, урад фашысцкай акупацыі хоча задушыць і разграміць рэвалюцыйны рух мас. Таму ў засьценках Віленскай і Сьвенцянскай дэфэнзывы гэтыя 100 арыштаваных КАТУЮЦЦА САМЫМ ЖОРСТКІМ ЧЫНАМ ДЛЯ ТАГО, КАБ ПРЫМУСІЦЬ ІХ ПАДПІСВАЦЬ САМЫЯ АГІДНЫЯ, САМЫЯ ПРАВАКАЦЫЙНЫЯ ФАЛЬШЫЎКІ.

Над арыштаванымі ў Сьвенцянскім павеце робіцца крывавая расправа. Прэса фашыстаў, сацыял і нацыянал-фашыстаў замоўчвае гэты бязумоўны факт. Акупанты рыхтуюць новую правакацыю, новую камэдыю суда, нават ўзмацненьне і абвастраньне карных экспэдыцый. Усьлед за Сьвенцянамі арышты адбываюцца і ў іншых паветах і раёнах. СПРАВА АРЫШТАВАНЫХ У СЬВЕНЦЯНШЧЫНЕ — ГЭТА КРЫВАВЫ ПАГРОМ ПРАЦОЎНЫХ УСЁЙ ЗАХ. БЕЛАРУСІ І НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАЙ БАРАЦЬБЫ.

Працоўныя БССР ставяць пытаньне—што сталася з арыштаванымі ў Сьвенцянскім павеце? Працоўныя пратэстуюць супроць новых правакацый польскага фашызму. ПЕРАД ТВАРАМ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН УСЯГО СЬВЕТУ ПРАЦОЎНЫЯ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ ЗАЯЎЛЯЮЦЬ, ШТО Ў ЗАХ. БЕЛАРУСІ ФАШЫСЦКІЯ ПРАВАКАТАРЫ І АКУПАНТЫ АРГАНІЗУЮЦЬ НОВЫЯ КАРНЫЯ ЭКСПЭДЫЦЫІ, НОВУЮ «ПАЦЫФІКАЦЫЮ».

РУКІ ПРЭЧ АД НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАГА РУХУ ПРАЦОЎНЫХ ЗАХ. БЕЛАРУСІ!

ПРЭЧ ПРАВАКАЦЫІ ФАШЫСТАЎ! ПРЭЧ КАРНЫЯ ЭКСПЭДЫЦЫІ Ў ЗАХ. БЕЛАРУСІ!

А. АЛЬШЭЎСКІ.

Украінскія папы ў Польшчы

АКТЫЎНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ ФАШЫЗМУ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ ІНТЭРВЭНЦЫІ

ВАРШАВА, 9. Лева-ўкраінская «Сіла» выкрывае актыўную падрыхтоўку польскімі і украінскімі фашыстамі адзінага антысавецкага фронту.

Кіруючую ролю адыгрывае «каталіцкі Украінскі Саюз». У радох гэтай арганізацыі дружна працуюць і адкрытыя прыхільнікі польскай буржуазіі, як Ліпінскі, і людзі, якія зьяўляюцца прадстаўнікамі нібы «баявой» антыпольскай палітыкі, як, напрыклад, адзін з кіраўнікоў УВА (Украінская вайсковая арганізацыя) Кучабскі.

Львоўскі біскуп Бучко заяўляе на старонках органу каталіцкага Украінскага саюзу «Міте», што «дзейнасьць саюзу зьяўляецца толькі часткай міжнароднай каталіцкай кампаніі, якая мае на мэце арганізацыю ўсеагульнага крыжовага паходу супроць бязьбожніцкаў-бальшавікоў».

«Савецкі Саюз—піша далей украінскі біскуп,—гэтэ царства д'ябла і яго трэба зьнішчыць як мага раней».

Адначасова ў «Міце» апублікована «пасхарскае пасланьне» мітрапаліта Шэптыцкага, які паведамляе, што «гістарычнай задачай вуніяцкіх папоў зьяўляецца работа па далучэньні да каталіцкай царквы мільённых мас, што насяляюць Савецкі Саюз».

«Сіла», спыняючыся на гэтых выступленьнях, піша:

«Відавочна з гэтай мэтаю каталіцкі саюз падрыхтоўвае ня толькі ваенныя кадры, але і белыя атрады з місыянэраў, папоў і іезуітаў, якія павінны наведніць тэрыторыю СССР, а пакуль што старанна працаваць на Валыні, Палесьсі і Зах. Беларусі».

34 ГАДЫ

ВАРШАВА, 1[illegible] ры «Зьвязды[illegible] працэсе 21 [illegible] ся 8 мая [illegible] цы. Прац[illegible] дапытана [illegible] скіх. Бес[illegible] казаньні [illegible] якая разго[illegible] чаго адна[illegible] паранена. [illegible] ны фашыс[illegible] насьці да [illegible]

Аб узмацненьні пагрозы ваеннай інтэрвэнцыі супроць СССР і задачы камуністаў*)

III. ЗАДАЧЫ КАМУНІСТАЎ У БАРАЦЬБЕ СУПРОЦЬ ПАДРЫХТОЎКІ ВАЕННАЙ ІНТЭРВЭНЦЫІ

Калі, ня гледзячы на ліхаманкавую падрыхтоўку міжнароднага імпэрыялізму і сацыял-дэмакратычных партый II Інтэрнацыяналу, вайна супроць СССР яшчэ ня выбухла, дык гэта тлумачыцца як існуючымі супярэчнасьцямі ў лягеры імпэрыялістаў, так і ў асаблівасьці растучай гатоўнасьцю пралетарскіх мас капіталістычных і калёніяльных краін падтрымаць пралетарскую дыктатуру ў СССР.

Нагнеркор паклёпніцкім кампаніям буржуазных і сацыял-дэмакратычных партый супроць палітыкі УсеКП(б), вялізарныя заваёны рабоча-сялянскіх мас у СССР усё больш і больш прыцягвае сымпатыі працоўных мас імпэрыялістычных і калёніяльных краін да СССР. Вясьпрэчна, што лік рабочых і наогул працоўных, якія гатовы актыўна і рэвалюцыйна абараняць СССР, як сваю адзіную бацькаўшчыну, пастаянна ўзрастае і выходзіць далёка за межы сферы палітычнага ўплыву камуністычных партый. Вясьпрэчна таксама, што работа Камінтэрну супроць небясьпекі імпэрыялістычных войн і ў абарону першай у сьвеце пралетарскай дыктатуры зрабілася адным з важнейшых задач захаваньня міру паміж народамі, фактарам, які выклікае адтэрміноўку імпэрыялістычнай бойні.

Тым ня менш неабходна канстатаваць, што інтэнсыўнасьць барацьбы супроць небясьпекі вайны, супроць небясьпекі ваеннай інтэрвэнцыі, у прыватнасьці, зьлёка не адпавядае тэмпу імпэрыялістычных ваенных падрыхтовак супроць СССР. Агітацыя супроць ваеннай небясьпекі вядзецца не сыстэматычна, а ў значнай меры ад выпадку да выпадку. Асноўная слабасьць работы Камінтэрну ў барацьбе супроць небясьпекі ваеннай інтэрвэнцыі зьяўляецца тая акалічнасьць, што канкрэтныя крокі падрыхтоўкі вайны ў парляманцкіх камісіях, у імпэрыялістычных арміях і на ваенна-прамысловых прадпрыемствах ня досыць выкрываюцца перад народнымі масамі. Камуністычныя партыі не навучыліся яшчэ даволі ясна тлумачыць шырокім народным масам сувязь паміж ваеннай падрыхтоўкай імпэрыялістаў і ростам эксплёатацыі і прыгнечаньня працоўных мас, яны не навучыліся яшчэ на канкрэтных прыкладах і сыстэматычна выкрываць сацыял-дэмакратыю, як апору імпэрыялістычнай буржуазіі ў справе падрыхтоўкі контр-рэвалюцыйнай вайны супроць СССР.

XI пленум ВККІ настойліва падкрэсьлівае, што ад актыўнасьці камуністычных партый капіталістычных краін у іх барацьбе супроць ваеннай небясьпекі, ад актыўнасьці кожнага асобнага камуніста залежыць, ці ператворыцца спачуваньне да рабочай клясы СССР з боку найшырэйшых мас рабочых, працоўных сялян, прыгнечаных нацый капіталістычных краін у актыўную рэвалюцыйную барацьбу супроць небясьпекі вайны і ваеннай інтэрвэнцыі супроць СССР, ці капіталістам удасца зноў павесьці працоўных па братазабойчую вайну. Абавязак кожнай камуністычнай партыі, кожнага асобнага камуніста выкрыць сацыял-дэмакратыю, як агентуру імпэрыялістычнай буржуазіі ў справе падрыхтоўкі ваеннай інтэрвэнцыі супроць рабочай клясы СССР, выкрыць іх ілжывы пацыфізм, як арганічную сустаўную частку ваенных падрыхтовак і адарваць ад іх рабочыя масы.

Абавязак кожнага камуніста — выкрыць, што пёзунгі буржуазіі і сацыялп

ПЕРАЛОМ ЗАБЯСЬПЕЧАН

Аргпартгрупы ЦК КП(б)Б за два з паловай месяцы сваёй работы ў 25 саўгасах дабіліся вялікіх посьпехаў ў перабудове работы саўгасных парт'ячэек

Задача мясцовых арганізацый—замацаваць гэтыя посьпехі і з бальшавіцкай настойлівасьцю змагацца за ператварэньне саўгасаў ў апорныя пункты партработы на вёсцы

Замацаваць посьпехі

Больш двух месяцаў назад Цэнтральны Камітэт КП(б)Б пакіраваў у саўгасы спэцыяльна складзеныя аргпартгрупы для дапамогі мясцовым арганізацыям у разгортваньні партработы, у замацаваньні саўгасаў.

Усяго ў работе аргпартгруп ЦК брала ўдзел 75 чалавек. У 25 жывёлагадоўчых саўгасах БССР па 2 з паловай месяцы працавалі аргпартгрупы. Матар'ялы, якія мы сёньня зьмяшчаем, гавораць аб тым, што аргпартгрупы ЦК за параўнальна кароткі пэрыяд правялі ў саўгасах вельмі вялікую работу.

У радзе саўгасаў была зусім дрэнна пастаўлена партработа. Ячэйкі вельмі слаба расьлі за лік перадавых рабочых-ударнікаў, вельмі марудна перабудоўвалі сваю работу. У радзе саўгасаў наглядалася распыленьне партыйных сіл. Аргпартгрупы ЦК у сэнсе перабудовы партработы ў саўгасах адыгралі надзвычай вялікую ролю. Папершае, у радзе месц, дзе ня было партыйных ячэек, гэтакія заснаваны, у радзе месц партарганізацыі перабудаваны, рэарганізаваны ў парткалектывы і, нарэшце, у радзе саўгасаў арганізаваны парткомы. Аргпартгрупы правялі вялікую работу па вярбоўцы ў партыю перадовых ударнікаў з с.-г. рабочых. Напрыклад, парт'ячэйка саўгасу «Самацэвічы» за пэрыяд работы аргпартгрупы вырасла па 8 чалавек. У саўгасе «Харомцы» ячэйка вырасла па 18 рабочых і г. д.

Перабудова партыйнай работы ў саўгасах набліжала ячэйкі і калектывы да пытаньняў унутры-гаспадарчага і вытворчага жыцьця саўгасаў.

Ячэйка саўгасу «Баноць-Бязьдзедавічы» вельмі слаба займалася пытаньнямі вытворчасьці. Пасьля-ж таго, як у ячэйцы папрацавала партгрупа, у рэзультаце перабудовы работы парткалектыў сваю работу перавёў на баявыя рэйкі.

Надзвычай вялікую работу правялі аргпартгрупы ў справе арганізацыі працы, увядзеньні зьдзельшчыны ў саўгасах, у справе разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод с.-г. рабочых.

Нельга прайсьці міма таго факту, што з ажыўленьнем партработы ў тых саўгасах, дзе працавалі аргпартгрупы ЦК, досыць шырока разгорнута палітыка-масавая работа сярод рабочых мас.

У справе разгортваньня падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай сяўбы, у справе арганізацыі калгаснага прыліву аргпартгрупы разам з партыйнымі арганізацыямі ў памянёных 25 саўгасах дабіліся вялікіх дадатных вынікаў. Дзесяткі новых калгасаў, сотні новых калгаснікаў — вось рэзультат работы аргпартгруп.

Той вялізарны зрух, якога дабіліся аргпартгрупы ў жывёлагадоўчых саўгасах, павінен быць ва што-б там ні стала замацаваны мясцовымі партарганізацыямі. Парт'ячэйкі суседніх саўгасаў, у якіх не працавалі аргпартгрупы, павінны па вопыце памянёных саўгасаў, дзе працавалі аргпартгрупы ЦК рашучым парадкам перабудоўваць сваю работу, ператвараючы саўгасы ў апорныя пункты партработы на вёсцы.

УЗОРНЫЯ ПРЫКЛАДЫ
перабудовы партработы ў саўгасах

Аргпартгрупы ЦК КП(б)Б, складзеныя пераважна з студэнтаў 3-га курсу Камвузу для ўдзелу ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, паказалі прыклады ўзорнай работы і бальшавіцкай барацьбы па арганізацыйным і гаспадарчым замацаваньні саўгасаў, па перабудове партыйна-масавай работы і ўзмацненьні кіруючай ролі саўгасаў і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

За два з паловай месяцы работы партгруп ёсьць значныя посьпехі ў справе гаспадарчага замацаваньня фабрык мяса і малака, у справе разгортваньня бальшавіцкіх тэмпаў калектывізацыі і замацаваньня існуючых калгасаў. Дзякуючы дапамозе аргпартгруп, парт'ячэйкі саўгасаў забясьпечылі новы рост творчай ініцыятывы і актыўнасьці саўгасных рабочых і мас калгаснікаў.

Аргпартгрупа тав. Буцько

працавала ў саўгасе **«Замошша»** (Плешчаніцкі раён), у якім налічваецца паўтары тысячы сьвінога-стада. Да прыезду партгрупы саўгасная ячэйка працавала слаба. Ва ўсёй яе рабоце панаваў самацёк. Рабочым таксама стаяў у баку ад вытворчых задач гаспадаркі. Адсутнічала правільная арганізацыя працы ў гаспадарцы і належная працоўная дысцыпліна.

Пры дапамозе аргпартгрупы ячэйка на ходу перабудавала сваю работу і пачыла на надыйшла да вытворчых пытаньняў. Распрацавана пытаньне ўкараненьня зьдзельшчыны ў саўгасе; уся рабочая сіла разьбіта на 16 брыгад. Праведзена вялікая работа па разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Усе камуністы расстаўлены на важнейшых вытворчых участках. Ва ўсёй шырыні пастаўлена перад партыйнымі і камсамольцамі пытаньне аб аўладаньні тэхнікай, і ў гэтым напрамку вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы.

Перабудаваўшы сваю работу, парт'ячэйка саўгасу вылучыла брыгады рабочых для ўдзелу ў калектывізацыі і падрыхтоўцы да сяўбы ў бліжэйшых сельсаветах. У рэзультаце гэтай работы Ганцавіцкі сельсавет калектывізаваны на 82 проц. Поруч з гэтым праводзіцца работа па гаспадарчым замацаваньні калгасаў і ўкараненьні ў іх зьдзельшчыны. Пры актыўнай дапамозе саўгаснай парт'ячэйкі вакольныя калгасы падрыхтаванымі выйшлі на палявыя работы.

Аргпартгрупа тав. Клімоўскага

працавала ў саўгасе **«Баноць-Бязьдзедавічы»** (Ветрынскі раён). У гэтай буйнейшай у БССР сьвінагадоўчай гаспадарцы (3 тыс. гэкт., 2.600 сьвіней), перабудова партработы была толькі ў зачатку. Ячэйка слаба займалася пытаньнямі вытворчага характару.

Зараз парт'ячэйка саўгасу рэарганізавана ў парткалектыў. Створан партком саўгасу, які аб'яднае 6 ячэек. Перабудова гэтай работы дала дадатныя вынікі. Парткалектыў за 2 месяцы вырас на 10 чал. у той час, як раней за такі-ж тэрмін парт'ячэйка мела рост толькі на 2 чалавекі.

Лёзунг тав. Сталіна — аўладаць тэхнікай — горача падхоплен камуністамі саўгасу. Гэта пытаньне распрацавалі ўсе ячэйкі і вызначылі канкрэтныя мерапрыемствы адпаведна ўмовам сваёй гаспадаркі. На адным вучастку механізавана падача вады, праведзены трактарныя курсы арганізаваны сьвінаводчыя курсы і курсы паляводаў. Прадукцыйнасьць работы трактараў значна павысілася. Замест ранейшага ўзороўваньня паўтара гэктара за 8 гадзін, зараз узоравецца 1,9 гэкт.

Камсамольцы саўгасу выступілі пачынальніцамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Адзін цэх, які складаецца з жанчын, паказаў узоры ў выкананьні зоолімінімуму. У выніку адходы апаросу зьменшыліся з 62 проц. да 20.

Вялікі эфэкт дала зьдзельшчына. Ка-[illegible] зьдзельшчыны на ад-[illegible]бочага па догляду сьвіней прыв[illegible] 25-30 сьвіняматак, зараз гэта пор-ма павялічылася да 35. Павысілася зацікаўленасьць і адказнасьць за даручаную работу.

Вопыт арганізацыі працы ў саўгасе парт'ячэйка перадае вакольным калгасам. **Вытворчыя пляны саўгасу былі прапрацаваны на сходах, дзе калгаснікі ўзбройваліся вопытам саўгасу, уводзілі планаваньне ў калгасе і пераходзілі на зьдзельшчыну.**

Пры актыўным удзеле парткалектыву саўгасу ў вакольных сельсаветах арганізавана за апошні час 8 новых калгасаў, адно таварыства на супольнай апрацоўцы зямлі і 2 ініцыятыўныя групы. **Шпакаўскі** сельсавет калектывізаваны звыш чым на 50 проц.

У саўгасе Негарэлае

Койдапаўскага раёну, арганізаваны партгрупы на чале з выбарнымі партарганізатарамі. Пры партбюро створаны сэктары: унутры-партыйнай работы, агітмасавы, сэктар праверкі ўдзелу камуністаў у сацспаборніцтве і сэктар тэхнічнай вучобы і друку. Саўгасная ячэйка за час работы партгрупы ЦК узрасла ў 3 разы і зараз рэарганізавана ў парткалектыў. **За 2 месяцы прынята ў партыю 22 рабочых з вялікім вытворчым стажам.**

Рабочыя саўгасу на 70 проц. ахоплены сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Ва ўсе асноўныя галіны работы ўведзена зьдзельшчына. У выніку пераходу на зьдзельшчыну лесапільны варштат апрацоўвае 60 кубаметраў лесаматар'ялу замест 26 кубаметраў. Раней 2 чалавекі па апрацоўцы кадраў абразалі за дзень 46 дроў, а зараз — 72. Замест ранейшай выязкі 3-х вазоў гною на аддалёсных, 6 клм., зараз вывозіцца 6. Побач з непасрэднай работай у саўгасе негарэльская парт'ячэйка абслугоўвае 6 калгасаў, калгасы ператвораны на зьдзельшчыну.

Аргпартгрупа ЦК сваю работу ў пядаўна арганізаваным саўгасе «Самацэвічы» (Касьцюковіцкі раён) пачала з арганізацыі там партыйнай ячэйкі. За 2 з паловай месяцы парт'ячэйка вырасла па 8 чалавек і правяла вялікую работу па мабілізацыі рабочых мас на выкананьне вытворчых задач саўгасу. Апрача таго, гэтай ячэйкай арганізаваны 2 новыя калгасы ў в. в. **Клетні і Прудо.** У калгас **«Чырвоны Інтэрнацыянал»** упяцьнута больш 300 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

З пераходам калгасаў на зьдзельшчыну хваля калектывізацыі ў Самацэвіцкім сельсавеце ўзьнялася яшчэ вышэй і зараз гэты сельсавет блізкі да суцэльнай калектывізацыі.

Аргпартгрупа тав. Сучакова

правяла такую-ж работу. Арганізавана парт'ячэйка ў **саўгасе Харомцы** (Глускі раён). У **Ляскавіцкім** сельсавеце арганізаваны новы калгас і 3 ініцыятыўных групы. У саўгасе былі створаны курсы па падрыхтоўцы да ўступленьня ў партыю, на якіх займалася 18 рабочых. 15 чалавек скончылі ўсе курсы прыняты ў рады КП(б)Б. Зараз парт'ячэйка саўгасу налічвае ў сваіх радах 20 чалавек. Яна з посьпехам спраўляецца з задачамі саўгаснага будаўніцтва. Работа ў саўгасе пераведзена па зьдзельшчыну, на чале рабочых брыгад пастаўлены камуністы і камсамольцы. **Саўгас напярэдадні выхаду ў поле абвясьціў сябе ўдарным і выклікаў на сацспаборніцтва саўгас «Беснава».**

Брыгады, цэлыя саўгасы і калгасы становяцца ўдарнымі і гэтым самым перавышаюць леташнія нормы выпрацоўкі. Важнейшым вагаром гэтай работы і бальшавіцкіх тэмпаў зьяўляецца зьдзельшчына.

Аргпартгрупы ЦК у сваёй рабоце выконвалі лёзунг тав. Сталіна — «Няма такіх крэпасьцей, якіх бальшавікі не маглі б узяць».

Адным з доводаў гэтага выкананьня зьяўляецца іх пасьпяховая работа ў саўгасах.

Салдаценка.

Аргпартгрупа ажывіла работу

Аргпартгрупа ЦК КП(б)Б, пасланая ў цэнтральную садова-гародную базу (Менскі раён), за пэрыяд сваёй дзейнасьці правяла значную работу.

Па-першае, група выкрыла цэлы рад момантаў бесгаспадарчасьці і шкодных настрояў, якія мелі месца сярод асобных адсталых рабочых. Група выкрыла рад праяўленьняў антысэмітызму і іншых нездаровых зьяўішч. Адразу-ж была разгорнута палітыка-масавая работа сярод рабочых: арганізаваны палітгурткі, курсы па павышэньні кваліфікацыі і г. д.

Да прыезду партгрупы на базе ня было партыйнай ячэйкі. Частка камуністаў, якія знаходзіліся ў падгаспадарцы Заціішша, былі прымацаваны чамусьці да Лошніцкай ячэйкі, а два таварышы, што знаходзіліся ў падгаспадарцы «Новы двор», складалі кандыдацкую групу. Арг. партгрупа ЦК арганізавала там ячэйку і ў першыя-ж дні яе арганізацыі былі завербаваны ў партыю 6 перадавых рабочых. Такім чынам, на базе зараз ёсьць ячэйка, якая налічвае 11 членаў і 6 кандыдатаў партыі. Яна ў поўнай меры здольна кіраваць гаспадарчым жыцьцём базы.

Х. КАНТАРОВІЧ.

Зрух зроблен

Апартуністычная стаўка на самацёк у выкананьні важнейшых дырэктыў партыі зьяўлялася сыстэмай у рабоце Сінчанскай парт'ячэйкі (Пухавіцкі раён). Гэта ячэйка павінна была абслугоўваць сельсавет і саўгас **Вялень-Сінча**, але фактычна работы яе не адчувалася.

Ячэйка стаяла ў баку ад вытворчых задач саўгасу і калгаснага руху бядняцка-серадняцкіх мас. Прамфінплян саўгасу, мабілізацыя рабочых на выкананьне гэтага пляну не займалі ніякага месца ў рабоце ячэйкі. Аб сацспаборніцтве рабочых былі разважаньні і пастановы, а сапраўдная ударная работы ня было. У мінулым годзе заключылі сацдагавары паміж брыгадамі, але выкананьнем абавязкаў на сацспаборніцтве ніхто ў саўгасе ня цікавіўся.

Адсутнасьць кіраўніцтва сацспаборніцтвам, поўная адсутнасьць масавай работы ў саўгасе прывяла да павялічэньня прагулаў сярод рабочых. Сярод найбольш адсталай часткі рабочых панырана п'янства і рвацкія настроі.

На гэтае нездаровае зьявішча, на прарывы ў выкананьні вытворчай праграмы саўгасу ячэйка не рэагавала.

Большасьць членаў ячэйкі палітычна неграмотная. Пастановы XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б), а таксама пастановы апошніх пленумаў ЦК партыі, дырэктывы па кантрактацыі ў ячэйцы не прапрацоўваліся. Гэта становішча паказвае, што ячэйка не магла забясьпечыць выкананьня дырэктыў партыі, не прапрацоўваючы гэтых дырэктыў і ня ведаючы іх. Рад партыйцаў, якія праводзілі тую ці іншую работу ў вёсцы, дапускалі блытаніну. У іх рабоце адсутнічала выразная партыйная ўстаноўка, а ў паасобных выпадках мела месца праваапартуністычная апэляцыя да беспартыйных мас на пастановы партыі. Ячэйка аднеслася прымірэнча да прапаганды погляду правага апартунізму.

У такім стане апартуністычнай бязьдзейнасьці Сінчанская парт'ячэйка знаходзіцца да часу прыезду туды аргпартгрупы ЦК КП(б)Б. За двухмесячны тэрмін знаходжаньня ў ячэйцы гэтай партгрупы, праведзена вялізарнейшая работа па аздараўленьні становішча ў ячэйцы і ліквідацыі прарываў як у рабоце саўгасу, так і тых, якія стварыліся ў Сінчанскім сельсавеце ў справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі і падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Партгрупа ЦК дапамагла ячэйцы выправіць яе памылкі, забясьпечыла працаўтоўку ўсіх асноўных дырэктыў партыі аб сацыялістычным будаўніцтве. Шырокая работа праведзена ў саўгасе сярод рабочых па мабілізацыі іх на ліквідацыю прарываў. Становішча ў саўгасе зараз значна зьмянілася ў бок паляпшэньня. З 1-га мая ўсе асноўныя галіны работы пераведзены на зьдзельшчыну. Большасьць рабочых перайшла на сапраўдныя ударныя тэмпы работы. Арганізаваны 4 ударныя брыгады імя 518 і 1040. У выніку ўсяго гэтага саўгас вышаў на палявыя работы ў поўнай падрыхтаванасьці.

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў Сінчанскім сельсавеце за апошнія паўтары-два месяцы павялічылася з 11 да 24 проц. У дзень 1-га мая калгаснікі арцелей «Спаборнік» і «Краіна саветаў» зьвярнуліся да бядняцка-серадняцкіх мас сельсавету з заклікам іх уступаць у калгасы і поўнасьцю выканаць клясавую веснавой сяўбы і кантрактацыі. Гэта адозва знайшла гарачы водгук з боку беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў.

І.

Пераключыліся на бальшавіцкія тэмпы работы

Парт'ячэйка **ПАЧАЎСКАГА** саўгасу (Чашніцкі раён) ня стала на чале падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай сяўбы. Насельне ачышчана ў сярэднім па сельсавеце толькі на 50 проц. Калгасы прыліў быў даволі мізэрным. Работу на кантрактацыі ячэйка праводзіла в вялікім спазьненьнем.

Парт'ячэйка не мабілізавала рабочых мас саўгасу вакол задач падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай сяўбы і разгортваньня калектывізацыі.

На перавыбарчым сходзе бюро парт'ячэйкі, які нядаўна адбыўся, партыйныя масы выкрылі праваапартуністычную практыку мінулага кіраўніцтва. Кіраўніцтва-ж на чале з тав. **Мамонавым,** замест таго, каб прызнаць свае праваапартуністычныя памылкі, імкнулася замазаць іх, прыкрываючыся «аб'ектыўнымі прычынамі».

Новае кіраўніцтва па-бальшавіцку ўзялося за выпраўленьне праваапартуністычных памылак, за разгортваньне работы па ажыцьцяўленьні асноўных палітычных задач партыі.

М. П.

Выпускнікі прапагандыцкага аддзяленьня КУБ'у

Камсамольцы Каралёва здаюць клясавыя пазыцыі

17 камсамольцаў у нашых умовах—вялікая камсамольская ячэйка. 17 камсамольцаў — рабочых саўгасу могуць, як кажуць, «горы перавярнуць». 17 камсамольцаў-ударнікаў могуць узьнець прац. дысцыпліну, разгарнуць ударніцтва і сацспаборніцтва, карыстаючыся імі — перавыконваць прамфінплян, высоўваць сустрэчныя пляны, з посьпехам выконваць 5-цігодкуза 4 гады і г. д., і г. д. Чаго толькі ня можа зрабіць калектыў з 17 камсамольцаў!

У саўгасе Каралёва ў камсамольскай ячэйцы 17 камсамольцаў. На чале ячэйкі — сакратар т. Мельнікаў. Кіруе ячэйкай, а значыць і працай сакратара — Койданаўскі райком камсамолу. З фармальнага боку — усё як належыць. Ад ячэйкі можна патрабаваць апраўданьня на практыцы начэпнае назвы чырвонасьцяжнага камсамолу.

Але азнаямленьне з жыцьцём, бытам і працай камсамоліі Каралёва ўпэўнівае нас у адваротным: аб сацспаборніцтве і ўдарніцтве ў саўгасе «толькі чулі». Калектыўны дагавор паміж прафсаюзам і гаспадарнікамі адхілен рабочымі. Культурна-масавая праца не разгорнута. Крытыка і самакрытыка ў загоне.

А як-жа 17 камсамольцаў?

Сакратар ячэйкі Мельнікаў, які адначасова зьяўляецца старшынёй рабкому і рэдактарам пасьценгазэты «хварэе за недахопы»..., а практычна нічога ня робіць. Ад удзелу на ўдарных брыгадах камсамольцы адмаўляюцца. На агульным сходзе, калі зацьвярджалі калектыўны дагавор, камсамольцы выступілі супроць яго. Крытыкай і самакрытыкай камсамольцы не займаюцца.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што камсамольская ячэйка саўгасу Каралёва спаўзла з клясавых рэек і пагразла ў правай практыцы.

А раённы камітэт камсамолу? Ці-ж ён аб усім гэтым ня ведае? Ведае, але асобныя працаўнікі райкому заняты ўсялякімі дробязямі і ім не хапае часу для кіраўніцтва ячэйкамі.

Справай поўнага развалу рабочай ячэйкі павінна зацікавіцца ўся камсамольская арганізацыя раёну.

Гэта справа павінна быць трывожным сыгналам і для райкому камсамолу, які па сёнешні дзень «за дрэвамі ня бачыць лесу».

М.

Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б
па дакладу Белазету аб становішчы і задачах АЗЕТ-работы

1. Адзначыць, што за апошні час у рабоце АЗЕТ'у маецца некаторы зрух і ажыўленьне работы па радзе АЗЭТаддзяленьняў, некаторае паляпшэньне кіраўніцтва імі з боку Белазэту. Аднак, да гэтага часу няма яшчэ належнага пералому ў дзейнасьці Азэтарганізацый, работа яшчэ значна адстае ад тых задач, якія ўскладзены на Азэт. У рабоце Азэт маюцца наступныя асноўныя недахопы:

а) слабасьць работы Азэтаддзяленьняў па арганізацыйным замацаваньні ячэек, па разгортваньні масавай і інтэрнацыянальна-выхаваўчай працы. У радзе раёнаў Азэтаддзяленьні яшчэ не арганізаваны;

б) пераважная большасьць Азэтарганізацый яшчэ ня ўключыліся ў працу па выкананьні бягучых гаспадарча-палітычных кампаній (пасеўкампанія, прамфінплян, калгасны прыліў, мабілізацыя сродкаў і г. д.);

в) слаба разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва, яшчэ няма належных ударных тэмпаў у працы Азэту;

г) веснавая кампанія па перасяленьні ў Крым, ня гледзячы на правядзеньне раду мерапрыемстваў апэрацыйнага характару (пакіраваньне брыгад у раёны і мястэчкі, мабілізацыя працаўнікоў для працы ў раёне, шырокае асьвятленьне гэтай кампаніі ў друку і г. д.) ня была разгорнута належным чынам, у выніку чаго маецца пагроза зрыву поўнага і своячасовага выкананьня нарадаў.

2. Сакратарыят ЦК КП(б)Б адзначае, што з боку райкомаў КП(б)Б, ЛКСМБ і Райпрафарганізацый няма яшчэ дастатковага кіраўніцтва працай Азэт і ўдзелу ў гэтай рабоце. Рад райарганізацый правялі педаацэнку работы Азэт, што асабліва ярка выявілася ў кампаніі па перасяленьні.

3. У сваёй далейшай рабоце Белазэт, ажыцьцяўляючы задачы па ўцягненьні ў сацыялістычнае будаўніцтва ў ўдзел ва ўцягненьні ў сацыялістычнае будаўніцтва ў ярэйскіх працоўных мас, накіроўваючы кадры ярэйскіх працоўных у асноўныя галіны прамысловасьці, і на перасяленчыя фонды ў Крым і Біра-Біджан, павінен пераключыцца на баявыя тэмпы работы з тым, каб поўнасьцю выканаць нарады па перасяленьні і ў прамысловасьць. У гэтай працы БелАзэт павінен разгарнуць рашучую барацьбу з правымі правага і «левага» апартунізму, з нац-апартунізмам, з тэндэнцыяй адрыву сваёй працы ад агульных задач на сацыялістычным будаўніцтве, а таксама з недаацэнкай працы на гаспадарным упарадкаваньні ярэйскіх працоўных мас і з ліквідатарскімі адносінамі да працы АЗЭТ'у.

4. АЗЭТ'у працягваць работу па дзяржфондах БССР, вылучаных для засяленьня ярэйскіх працоўных. Канстатуючы аслабленьне работы па гэтых фондах, прапанаваць АЗЭТ'у работу ўзмацніць. Калгасцэнтру, праз сваю сыстэму, прыняць меры да ўмацаваньня калгаснага будаўніцтва па гэтых фондах і спрыяць повазу прыліву калгаснікаў.

5. Уся праца па падрыхтоўцы кантынгентаў і арганізацыі перасяленьня ў Крым і Біра-Біджан павінна быць праведзена з пункту погляду выяўленьня і скарыстаньня для гэтай мэты ня ўжо яшчэ кадраў з ярэйскіх працоўных і дэклясаванай беднаты з мястэчак і гарадоў, якія яшчэ ня ўцягнуты ў сацыялістычнае будаўніцтва і ў творчую працу наогул. Лічыць няправільнай устаноўку ЦС АЗЭТу на перасяленьне ў Крым і Біра-Біджан калгасаў, на адвіданьне дробных ярэйскіх калгасаў БССР для іх перасяленьня. Дробныя ярэйскія калгасы зусім не зьяўляюцца беспэрспэктыўнымі. Гэтыя калгасы павінны быць разбураны, а пашдзяроты—павінны быць узмоцнены і гаспадарча ўмацаваны. ЦК КП(б)Б перасьцерагае ад пасьпешнай інтэрнацыяналізацыі ярэйскіх калгасаў і асуджае спробы ліквідацыі ярэйскіх калгасаў.

Разам з гэтым патрэбна весьці барацьбу з тэндэнцыямі замкнутасьці ў ярэйскіх калгасах, праводзячы растлумачальную працу супроць нацыянальнай абмежаванасьці, шавінізму, антысэмітызму і г. д.

Веснавая пасеўкампанія і масавы прыліў у калгасы павінны быць скарыстаны для ўзбуйненьня і арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня існуючых ярэйскіх калгасаў, для разгортваньня ў іх сацспаборніцтва і ўдарніцтва для палепшэньня абслугоўваньня калгаснікаў на іх роднай мове.

6. Прапанаваць райкомам КП(б)Б узмацніць кіраўніцтва АЗЭТаддзяленьнямі і паляпшыць працу па абслугоўваньні ярэйскіх калгасных мас.

7. Адзначаючы асаблівае значэньне 3-й Азэт-лётарэі прапанаваць Белазэту ўзмацніць гэту кампанію, скарыстоўваючы яе ў мэтах узмацненьня ўсёй масавай работы, узмацненьня рэарганізацыі і інтэрнацыяналізацыі складу АЗЭТу зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўцягненьне ў АЗЭТ калгасных мас.

8. АЗЭТарганізацыі павінны сваю працу па падборы кадраў на перасяленьне—гэту сваю непасрэдную задачу—шчыльна ўвязаць з актыўным сыстэматычным удзелам ва ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаніях, што праводзяцца партыяй і ўладай.

Азэту разгарнуць шырокую выхаваўчую працу ў масах, вядучы барацьбу супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, супроць небясьпекі ў сучасны пэрыяд супроць беларускага нацдэмакратызму, супроць ярэйскага шавінізму і рэштак бундаўскіх настрояў, супроць валяўнічага клерыкалізму, супроць усякіх адхіленьняў ад генэральнай лініі партыі і ленінскай нацыянальнай палітыкі.

9. Даручыць Аддзелу кадраў ЦК накіраваць двух адказных працаўнікоў для працы ў апараце БелАЗЭТ'у.

Пачаўся месячнік самаправеркі і перабудовы прафработы

Перабудову прафработы—на рэйкі сацспаборніцтва

Посьпех бальшавіцкай сяўбы, рост калектывізацыі, ліквідацыя прарываў, выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну—асноўны паказальнік перабудовы

На барацьбу за ажыцьцяўленьне задач праверкі мабілізаваць масы рабочых, членаў прафсаюзаў!

Баявыя задачы месячніка

Прэзыдыум ЦСПСБ 9-га мая вынес пастановы аб перанясеньні 7-га Усебеларускага зьезду прафсаюзаў на восень.

Адначасова прэзыдыум прапанаваў прафарганізацыям пераключыць усю увагу на месячнік праверкі і перабудовы прафработы.

У пастанове гаворыцца: «У зьвязку з задачамі пасьпяховага разгортваньня калектывізацыі і своячасовага завяршэньня другой бальшавіцкай вясны, што патрабуе мабілізацыі ўсіх сіл, — склікаць 7-га Усебеларускага зьезду перавесьці на восень 1931 г.».

Сэнс гэтай пастановы вусім ясны. Задачы, пастаўленыя XVI зьездам УсеКП(б) перад прафсаюзамі ў галіне рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, вялізарныя. **Прафсаюзы Беларусі ў поўнай меры адказваюць за справу капэктывізацыі, за выніні другой бальшавіцкай вясны.**

Няма сумненьня, што прафсаюзы Беларусі маюць сурэзныя посьпехі ў справе паваротту тварам да рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Пасылка «25-тысячнікаў», 1-ы Усебеларускі зьезд, які праведзены в «25-тысячнікамі», пасылка сотень рэмонтных і агітмасавых брыгад з тысячамі рабочых, членаў прэзыдыуму ЦСПСБ, ГПС і РПС на веснавую пасеўную кампанію — усё гэта гаворыць аб значнай рабоце, якая была праробленa прафсаюзамі ў гэтай галіне.

Тым ня менш, тэмпы калектывізацыі і ход сяўбы ў БССР нас ні ў якім разе задаволіць ня могуць.

Дырэктыва партыі і ўраду, аб давядзеньні процанту калектывізацыі да веснавой сяўбы на 35 проц. далёка яшчэ ня выкананa.

Адсюль простая задача перад прафсаюзамі Беларусі: **на працягу бліжэйшага адрэзка часу да канца пасеўнай кампаніі намагчы ўсе свае сілы, мабілізаваць усе рэсурсы на ўзмацненьне справы калектывізацыі, пашырэньне яе і пасьпяховае скончэньне сяўбы.**

Зразумела, што адрываньне дзесяткаў і сотень прафсаюзных работнікаў гарадоў і раёнаў, фабрычна-заводзкага актыву на зьезд у самы разгар разгортваньня сяўбы, адначала-б, па сутнасьці, нанесьці ёй значны ўрон, адначала-б дэмабілізацыю на паўны тэрмін сотень работнікаў у выкананьні адной з цэнтральных задач партыі.

Аднак, ці адмяняецца ў зьвязку з перанясеньнем 7-га Усебеларускага зьезду саюзай тая праграма дзейнасьці, якая ў галіне падрыхтоўкі была паказана ў адозьве ЦСПСБ і Менскай гарадзкой прафсаюзнай канфэрэнцыяй? Ні ў якім разе. Ня толькі не адмяняецца, але ў вышэйшай ступені ўдасканальваецца. Гэтая праграма дзейнасьці вынікае з задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, які дыктуе неабходнасьць усямернага далейшага паляпшэньня прафработы, тэрміновага правядзеньня ў жыцьцё пастановы 5-га пленуму УсеЦСПС, як у прадпрыемствах (групп, цэх, агрэгат, вучастак), так і ў сельскай гаспадарцы (калектывізацыя, масавыя палітычна-гаспадарчыя кампаніі) дыктуюць усім прафсаюзным арганізацыям, пачынаючы з ударнай брыгады і канчаючы ЦСПСБ не марудзячы перабудаваць работу.

Трэба тэрмінова перанесьці цэнтр цяжару ўсёй прафработы ў групу, агрэгат, цэх, вучастак.

Неабходна зараз-жа на кожным прадпрыемстве скончыць перабудову работы вытворчых нарад і ўзмацніць сыстэму скліканьня іх па вядучых прафэсіях; неабходна за гэты месяц палажыць канец тэй расхлябанасьці, якая ўсё яшчэ існуе ў справе праверкі і рэалізацыі рабочых прапаноў, радыяналізацыі прадпрыемстваў і вынаходніцтва.

Вялізарнейшы лёзунг рэканструкцыйнага перыяду аб аўладаньні тэхнікай яшчэ, на жаль, не атрымаў шырокага ажыцьцяўленьня. Пытаньне далёка невыстарчальна завострана на прадпрыемствах.

Пытаньне мабілізацыі фінансавых сродкаў, унутраных рэсурсаў, пытаньне скарачэньня перагляду норм выпрацоўкі і перавод прадпрыемстваў, цэхаў і брыгад на гаспадарчы разрахунак у шмат мясцох яшчэ канчаткова ня вырашана, а гэтай важнейшай палітычна-гаспадарчай рэформай таксама марудзяць.

Шэфства пралетарыяту над савецкім апаратам, сапраўдны масавы кантроль найшырэйшых рабочых мас і дапамога рабоце каапэрацыі, сапраўдны кантроль і ўдзел ва ўзмацненьні прыгарадных гаспадарак, якія закліканы адыграць вялізарную ролю ў справе палепшэньня рабочага забесьпячэньня, усе гэтыя задачы патрабуюць па-сяе неадкладнай і належнай увагі з боку фабрычна-заводзкіх арганізацый у часе праверкі перабудовы прафработы.

Ня гледзячы на рад посьпехаў, якіх прафсаюзы дабіліся на працягу апошніх год у галіне правядзеньня **нацыянальнай палітыкі,** усё-ж становішча далёка незадавальняючае. Прафактыў паніжэньня дабіцца ўзмацненьня работы па беларусізацыі, выкарыстаўшы месячнік для шырокай растлумачальнай работы сярод шырокіх рабочых мас аб значэньні і важнасьці беларусізацыі, дабіваючыся на вожным прадпрыемстве стачэчных вынікаў. Адначасова трэба дабіцца паляпшэньня пастаноўкі абслугоўваньня нацменшасьцей.

Пасьпяховасьць месячніка будзе забясьпечана тоўкі тады, калі ФЗМК ЦК і ЦСПСБ па-сапраўднаму ўцягнуць сотні і тысячы добраахвотнікаў на ўсе галіны прафработы на прадпрыемстве, саўгасе і г. д.

Гэтыя добраахвотнікі і павінны стаць у першую чаргу ініцыятарамі праверкі перабудовы прафработы.

Пасьпяховасьць месячніка праверкі і перабудовы прафработы будзе забясьпечана толькі тады, калі кожны вучастак работы, кожны недахоп падпадзе пад агонь самай жорсткай **пралетарскай крытыкі і самакрытыкі,** калі самакрытыка зьявіцца сталым мэтадам работы, будзе максымальна дзейснай.

Для практычнага правядзеньня месячніка ЦСПСБ ужо прыняў рад практычных пастаноў: **мабілізавана да 30 чал., у тым ліку большасьць членаў прэзыдыуму ЦСПСБ, непасрэдна для ўдзелу ў пасеўнай кампаніі, мабілізавана 10 адказных работнікаў ЦСПСБ, якія ўжо выехалі на больш буйныя прадпрыемствы для аказаньня дапамогі мізавым прафарганізацыям у перабудове сваёй работы.**

Побач з гэтым, прэзыдыум ЦСПСБ абавязаў ЦП саюзаў, асабліва тых, дзе вытворчасьць мае вядучае значэньне, накіраваць на пэрыферыю мансымальную колькасьць работнікаў для ўдзелу ў памянёнай вышэй рабоце.

Вызначаны месячнік праверкі павінен даць яшчэ большае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, арганізацыю новых ударных і «сквозных» брыгад, наладжаньне радыяналізатарскай работы, ліквідацыю прагулаў, тэхнічных непаладак і ўшчыльненьне рабочага дня. Трэба дабіцца, каб прамфінплян другога кварталу быў выкананы і перавыкананы, каб вынікі пасьпяховага выкананьня яго цапкам забясьпечылі і падрыхтавалі просты шлях да безагаворачнага выкананьня пляну трэцяга году пяцігодкі ў цэлым.

Для ўяўленьня ўсёй важнасьці задач, якія стаяць перад прафсаюзамі на працягу бліжэйшага пэрыяду, кожны прафработнік, кожны прафактывіст абавязаны з усёй уважлівасьцю вывучыць пастановы V пленуму УсеЦСПС. **«Мера навышых задач у 1931 г. лепш за ўсё можа быць вызначана тым, што ў 1931 годзе на аснове далейшага разгортваньня прамысловасьці, узмацненьня і разьвіцьця калектывізацыі і сельскай гаспадаркі, мы будзем мець абсалютную перавагу сацыялістычных элемэнтаў над капіталістычнымі».** (Швэрнік).

Вось чаму трэба паміраваць усе сілы на максымальнае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб павароце прафсаюзаў тварам да вытворчасьці, на

Ударная масавая сяўба і зьдзельшчына—
ЛЕПШЫ АГІТАТАР ЗА КАЛГАС

АДЦЯГВАНЬНЕ АБАГУЛЕНЬНЯ АСНОЎНЫХ СРОДКАЎ ВЫТВОРЧАСЬЦІ У КАЛГАСАХ БЯРЭЗІНШЧЫНЫ—АДЗІН З МЭТАДАЎ КЛЯСАВАГА ВОРАГА ЗАТРЫМАЦЬ РАЗГОРТВАНЬНЕ СЯЎБЫ

Самая рашучая барацьба з апартунізмам. Руйнуючы адпор кулаку, які ўсімі мерамі імкнецца затармазіць тэмпы сяўбы і калектывізацыі

Даць адпор кулаку і яго агентам апартуністам, якія імкнуцца падарваць гаспадарчую моц калгасаў

У Бярэзінскім раёне недаацэньваюць гаспадарчага замацаваньня калгасаў

Арганізацыя новых калгасаў, якія выраслі ў выніку магутнага калгаснага прыліву, ставяць перад усімі мясцовымі арганізацыямі задачу аб гаспадарчым замацаваньні гэтых калгасаў.

Дырэктывы вышэйшых органаў пераконваюць, што пасьля арганізацыйнага афармленьня калгасаў зараз-жа павінна праводзіцца гаспадарчае замацаваньне калгасаў і ў першую чаргу асноўных сродкаў вытворчасьці.

Наперакор дырэктывам партыі, правыя апартуністы з Бярэзінскага раёну затрымліваюць замацаваньне новаарганізаваных калгасаў і тым самым дапамагаюць кулаку.

Арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньнем калгасаў у раёне ніхто на займаецца. Абагульваньне сродкаў вытворчасьці знаходзіцца ў агіднейшым становішчы, асабліва дрэнна з абагульваньнем рабочай і прадуцыйнай жывёлы. Такое становішча ня толькі ў новаарганізаваных калгасах, але і ў старых, якія арганізаваны яшчэ ў 1930 г. Па радзе калгасаў абагульваньне адкладвалася да вясны, а цяпер адкладваецца да восені, такое становішча ў калгасе Імя Багінскага і інш.

ПА РАЁНЕ НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ НЕ АБАГУЛЕНА БОЛЬШ 300 РАБОЧЫХ КОНЯЙ.

Калгас «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ», ВЯЛІЧАНСКАГА сельсавету, які арганізаваны ў пачатку мінулага году, да гэтага часу не [illegible] абагуліў прадукцыйнасьць жывёлы.

У гэтым калгасе, калгасьнікі, якія маюць па 2-3 каровы, спажываюць таварныя лішні малака ад абагуленага стада.

Старшыня калгасу — член партыі, БЕЛАХВОСЬЦІК да гэтага часу не абагуліў 3 кароў. Мала гэтага, на сям'ю ў 6 чал. ён атрымаў ад калгасу: 204 літры малака, 7 кіпё масла, 30 кіпё сала і 20 кіпё мяса. Рахункавод, партыец БЕЛАХВОСЬЦІК ПЯТРУСЬ, таксама мае карову. Але гэта яму не перашкодзіла на сям'ю з 3 чал. набраць за 2 месяцы 45 літраў малака, 7 кіпё масла, 17 кіпё сала і 16 кіпё мяса. Пад крыдом старшыні і рахункавода распаўсюджваецца рвацтва і разбазарваньне калгасных фондаў сярод калгасьнікаў.

Перавод калгасаў на зьдзельшчыну праходзіць зусім марудными тэмпамі. На зьдзельшчыну пераведзена толькі 35% калгасьнікаў.

Кармавыя фонды ў большасьці калгасаў ня былі створаны. Ёсьць выпадкі аддачы на корм жывёлы насенных фондаў.

Пра ўсе гэтыя агіднейшыя справы, бязумоўка, ведае Бярэзінскі райкалгасаюз, але ён ніякіх мер ня прымае. З боку раённых арганізацый няма чалежнага кіраўніцтва калгасамі. Калгасы прадастаўлены самім сабе і ў выніку чаго ёсьць рад прарываў.

Патрэбна рашучая і неадкладная чыстка калгасаў ад кулацкіх і варожых элементаў, якія перашкаджаюць калгаснаму будаўніцтву.

Неабходна з усёй рашучасьцю ўдарыць па недаацэнцы сваячэсовага гаспадарчага замацаваньня калгасаў. Апартуністычная недаацэнка гаспадарчага замацаваньня калгасаў павінна быць зьнішчана.

П.

АРГАНІЗАВАЦЬ ПРАВІЛЬНЫ ЎЛІК ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ

Кожны калгасьнік павінен ведаць колькі ён выпрацаваў за дзень

Усім старшыням райвыканкомаў сакратаром райкомаў, старшыням калгассаюзаў, упаўнаважаным ЦК і СНК

Дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб поўным пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну ў большасьці раёнаў ня выконваюцца. Асабліва награжае зрывам пераводу калгасаў на зьдзельшчыну адсутнасьць правільнага ўліку зьдзельнай работы калгасьнікаў. Не вядзецца такога ўліку работы, згодна якога калгасьнік кожны дзень ведаў бы колькі працадзён ён выпрацаваў за дзень. Працягваецца старая практыка ўліку (падзёншчына) незалежна ад выпрацоўкі.

Такое становішча зьніжае зацікаўленасьць калгасьнікаў ва ўздыме вытворчасьці, зьніжае працоўную дысцыпліну, выклікае сярод калгасьнікаў настроі разьмяркоўваць прыбыткі і ўраджай на ядоцкім прынцыпе, а не па колькасьці і якасьці працы.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР прапануюць сканцэнтраваць асноўную ўвагу работнікаў, якія працуюць на пасеўкампаніі, на праверцы правільнасьці ўліку працы ў кожным калгасе. Мабілізуйце дадаткова людзей з разьлікам ахопу ўсіх калгасаў у дэкадны тэрмін, арганізаваўшы правільны ўлік працы ва ўсіх калгасах.

Улік працы арганізаваць выключна на аснове норм выпрацоўкі, вылічаных у працадні.

У тэлеграфнай справаздачнасьці, апрача колькасьці калгасаў пераведзеных на зьдзельшчыну, абавязкова паказваць колькасьць калгасаў, якія правільна арганізавалі ўлік.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.
За сакратара ЦК КП(б)Б ЧАРНУШЭВІЧ.

АБ РАБОЦЕ СЯРОД КАЛГАСЬНІЦ

(Пастанова ЦК УсеКП(б)

Масавая работа сярод калгасьніц у 1930 г. была пастаўлена зусім нездавальняюча; гэта становішча асабліва рэзка выявілася ў недапушчальна нізкім удзеле калгасьніц у тых галінах сельскай гаспадаркі і на тых відах с.-г. работы, дзе звычайна ўжываецца пераважна жаночая праца. У 1931 г. — ва ўмовах далейшага вялізарнага ўздыму калгаснага руху—у наўнасьці ня толькі колькасны рост ніку сялянак-бяднячак і сераднячак, ахопленых калгасамі, але і бясспрэчны зрух у настроях масы калгасьніц у карысьць калектыўнай працы і калектыўнай гаспадаркі. Гэты пераломам павінен быць замацован шляхам рашучага разгортваньня масавай работы сярод калгасьніц і выкарыстан як вагар далейшай мабілізацыі сялянак-адноасобніц вакол калектывізацыі.

ЦК ставіць наступныя задачы перад мясцовымі партыйнымі арганізацыямі, Калгасцэнтрам і яго нізавымі арганізацыямі:

1. Папажыць у аснову масавай работы сярод калгасьніц разьвіцьцё вытворча-гаспадарчай актыўнасьці і ініцыятывы шляхам шырокага ўжываньня жаночай працы на ўсіх відах с.-г. работ, у тым ліку і кваліфікаваных (трактары, складаныя машыны), правільную арганізацыю працы (зьдзельшчына), разгортваньне сярод калгасьніц сацсаборніцтва, ударництва, агратэхнічнай вучобы. Асаблівую ўвагу сканцэнтраваць на найбольш поўным выкарыстаньні жаночай працы і разьвіцьці гаспадарчай ініцыятывы ў такіх галінах сельскай гаспадаркі, як тэхнічныя культуры (лён, пянька, каноплі, бавоўна, цукровыя буракі, тытун, гароднічтва), малочная жывёлагадоўля і маслазагатоўкі, птушкагадоўля і яйцазагатоўкі.

2. Перабудаваць адпаведна да гэтых асноўных задач работу дэлегацкіх сходаў калгасьніц і бязумоўна дабівацца масавага ўцягненьня жанчын-калгасьніц у калгасныя вытворчыя нарады, а таксама практыкаваць спэцыяльныя вытворчыя нарады жанчын-калгасьніц па такіх галінах гаспадаркі, у якіх праца жанчыны зьяўляецца асноўнай (гароднічтва, малочная гаспадарка, птушкагадоўля і інш.), ужываючы брыгадна-вытворчы прынцып, спэцыялізуючы работу па галінах сельскай гаспадаркі і шырока прыцягваючы калгасьніц да выкананьня абавязацельстваў агразоа- і вэтупаўнаважаных сельсаветаў, жаночыя вытворчыя нарады пры сельсаветах выкарыстаць у раёнах, яшча не ахопленых суцэльнай калектывізацыяй, для згуртаваньня аднаасобніц вакол калгасьніц і пад іх кіраўніцтвам.

3. Разгарнуць на аснове грамадзкай самадзейнасьці калгасьніц масавую культурна-бытавую работу вакол ясьляй, дзіцячых садоў, школьных і пекавых устаноў з тым, каб неадкладна падрыхтавацца да абслугоўваньня дзяцей калгасьніц у час уборачнай кампаніі, тым самым палегчыць антыўны ўдзел калгасьніц ва ўборцы ўраджаю.

4. Паставіць падрыхтоўку і вылучэньне кадраў з калгасьніц як на нізавую кіруючую вытворчую і культурна-бытавую работу (брыгадзіры, заг. гаспадарчымі вучасткамі, тэхнічныя пасады па малочнай справе, выхавальніцы ў ясьлях і дзіцячых садох і інш.), так і на работу ў праўленьнях калгасаў і на кіраўніцтве асобнымі калгаснымі прадпрыемствамі (маслазаводы, заводы па пераапрацоўцы с.-г. сырцу і інш.); у сувязі з гэтым распрацаваць канкрэтны плян з паказаньнем тэрмінаў і колькаснага ахопу калгасьніц спэцыяльнымі агратэхнічнымі курсамі, падрыхтоўкай у ВНУ, ВТНУ, вылучэньні на кіруючую работу, а таксама арганізаваць спэцыяльныя курсы для падрыхтоўкі калгасьніц па пытаньнях культурна-бытавога жыцьця калгасаў.

ЦК прапануе:

1. Калгасцэнтру даць указаньне на месцы аб правільным выкарыстаньні спэцыяльных сродкаў, якія адпічваюцца ў культурна-бытавыя фонды калгасаў.

2. Францыям ЦВК СССР і ЦВК саюзных рэспублік забясьпечыць выдзяленьне сродкаў з культурна-бытавых фондаў і прадугледзець асыгнаваньне гэтых сродкаў у бюджэтах будучага году краёў, абласьцей і нацрэспублік.

3. Наркамасьветы саюзных рэспублік і таварыству «Прэч няпісьменнасьць» шырэй разгарнуць работу па ўзьняцьці культурнага ўзроўню калгасьніц, ліквідацыі агульнай і тэхнічнай няпісьменнасьці сярод іх, максымальна прыстасоўваючы сетку пікпунктаў да калгаснай вытворчасьці.

4. Культпропу ЦК забясьпечыць вялікую падрыхтоўку і перападрыхтоўку нізавых партыйных работнікаў сярод жанчын ва ўсёй сыстэме курсаў партработнікаў і партасьветы, а таксама забясьпечыць сыстэматычны агляд ў цэнтральным і мясцовым друку масавай работы сярод калгасьніц і бядняцка-серадняцкіх жаночых мас у вёсцы.

5. Разьмеркавальнаму аддзелу ЦК у месячны тэрмін праверыць выкананьне дырэктыў ЦК аб вылучэньні калгасьніц на кіруючую гаспадарчую работу, аб падрыхтоўцы жаночых вытворчых кадраў і аб падрыхтоўцы калгасьніц у ВНУ, ВТНУ і на спэцыяльныя курсы.

6. Аддзелу агітацыі і масавых кампаній ЦК арганізаваць сыстэматычны нагляд за выкананьнем данай дырэктывы ЦК і з свайго боку забясьпечыць разгортваньне масавай работы сярод калгасьніц у адпаведнасьці з данай пастановай.

Калгас „Прасьвет" скончыў сяўбу раньніх яравых

АЗАРЫЧЫ. Калгас «ПРАСЬВЕТ», Азарычскага раёну, [illegible] ударнаму, разгарнуўшы палявыя работы і перайшоўшы на зьдзельшчыну, ужо скончыў сяўбу раньніх яравых. УДАРНАЯ РАБОТА калгасьнікаў ВЫКЛІКАЛА ПРЫЛІЎ. Улілося новых 15 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Калгас «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ» абавязаўся скончыць сяўбу да 20 мая, перайшоўшы на зьдзельшчыну. У гэты калгас у апошнія дні таксама ўліліся новыя 4 гаспадаркі.

* *

Калгасы ДАМАНАВІЦКАГА сельсавету пачалі палявыя работы з вялікай энэргіяй і напружанасьцю.

Калгасы: «НОВЫЯ ХАЛОДНІКІ», «КАМУНА», «АВАНГАРД», «Н.-ДАМАНАВІЧЫ», «Н.-ТАРКАНЫ», «ЧЫРВОНАЯ ДУБРОВА», «Н.-СЯЛЬЦЫ», «КУЛЬТУРА», «КАЛГАСЬНІК БЕЛАРУСІ» ВЫСУНУЛІ СВАЕ СУСТРЭЧНЫЯ ПЛЯНЫ СЯЎБЫ. Кантрольныя лічбы па кантрактацыі яравых выкананы з перавышэньнем.

Гэтыя калгасы цалкам перайшлі на зьдзельшчыну. Частка брыгад калгасаў, абясьсілі сябе ударнымі. Ударныя брыгады сваім прыкладам і перавыкананьнем папярэдніх пляновых намячэньняў выклікаюць працоўны энтузіязм усіх калгасьнікаў. Веснавая сяўба да 20 мая будзе цалкам скончана.

Беднякі і сераднякі — аднаасобнікі, бачачы ударныя тэмпы работы калгасаў і правільную расстаноўку сіл, уступаюць у калгас. У калгас «Новыя Тарканы» ўступіла 14 гаспадарак. У калгас «Н.-ДАМАНАВІЧЫ» —30 гаспадарак. В. Халоднікі ўжо калектывізаваны на 70 ПРОЦ.

Наступ Даманавіцкі сельсавет, дзякуючы разгортваньню масавай работы і добрай працы парт'ячэйкі сельсавету і камсамольскага калектыву, ужо калектывізаваны на 60 проц.

Даманавіцкія калгасьнікі выклікаюць пасьледаваць іх прыкладу іншыя сельсаветы раёну з тым, каб датэрмінова скончыць веснавую сяўбу.

Брыгада:
А., Кузьмянок, Т. Міцкевіч, К. Цішкевіч.

Бюракраты і абломавы зрываюць зьдзельшчыну

ХАЛОПЕНІЧЫ. (Наш кар.).

Пад гледзячы на пераход калгасаў на зьдзельшчыну, што патрабуе сапраўды жыгога кіраўніцтва, некаторыя адказныя работнікі працуюць і далей пастарому, мэтадамі абломаўшчыны. Гэта награжае сарваць укараненьне зьдзельшчыны. Вось некалькі характэрных фактаў, якія малюць бюракратычныя адносіны да сваіх абавязкаў з боку асобных адказных зямельна-калгасных работнікаў.

На 7 мая было назначана рассадка саду ў Халопенецкім калгасе. Кіраваць гэтай справай павінны былі старшыня райкалгассаюзу—тав. Шавель і агранам Лазэрка. У назначаную гадзіну—у 7 гадз. 30 мін. раніцою—на поле сабралася ўся садова-гародная брыгада—калгасу. Калгасьнікі чакалі 2 гадзіны, а кіраўнікі ня прышлі. Лічачы нямэтагодным марна траціць дарагі час, 15 калгасьнікі пайшлі дадому. 20 чалавек засталіся чакаць і, не дачакаўшыся, паслалі на начальства. Аказапася, што тав. Шавель спакойна сьпіць, а яго намесьнік—агранам тав. Лазэрка спакойна сядзіць у канцылярыі. Гэта яшчэ больш абурыла калгасьнікаў, якія замест дапамогі ва ўдарным разгортваньні веснавой насеўнай кампаніі, спаткалі бюракратычныя адносіны да сябе.

Другі факт. Раённы каморнік тав. Савіч дагаварыўся з праўленьнем Халопенецкага калгасу па 7 мая мераць зямлю. Праўленьне назначыла на гэту работу, якая павінна была пачацца ў 7 гадзін раніцы, двох калгасьнікаў. Калгасьнікі сваячасова прыйшлі на поле і... нічога не рабілі да 10 гадзіны раніцы, бо не зьявіўся каморнік.

Неабходна рашуча ўдарыць па бюракратыцтве і абломаўшчыне, якая перашкаджае ажыцьцяўленьню зьдзельшчыны і тармозіць разгортваньне сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў сяўбы.

Бліскучая праца жаночых брыгад аратых

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.).

Укараненьне зьдзельшчыны, ацэненай у працадніях, дазволіла калгасу імя 10-годзьдзя БССР (Новасельскі сельсавет) сапраўды па-бальшавіцку разгарнуць сяўбу. Прадукцыйнасьць працы значна ўзрасла. ЛІКВІДАВАНЫ ПРАГУЛЫ І СПАЗНЕНЬНІ НА РАБОТУ. Работа праходзіць дружна і арганізавана. Ня толькі калгасьнікі, але і калгасьніцы паказваюць узор бальшавіцкай барацьбы за ўшчыльненьне тэрміноў сяўбы.

БЛІСКУЧЫ ПРЫКЛАД ПАКАЗАЛІ ЖАНОЧЫЯ БРЫГАДЫ Ў КАЛГАСЕ «ПРАЛЕТАРЫ», якія свае ВЫТВОРЧЫЯ ЗАДАНЬНІ ПА ВОРЫВЕ ВЫКАНАЛІ ЗА 3 ДНІ ЗАМЕСТ 4-х, намечаных паводле пляну. НАПЕРАДЗЕ ІДЗЕ ЎДАРНАЯ БРЫГАДА АРАТЫХ ІМЯ 1.040, якая складаецца з 10 калгасьнікаў. Гэта брыгада, МАЮЧЫ ЗАДАНЬНЕ ЎЗАРАЦЬ 36 ГЭКТ. ЗА 6 ДЗЁН, атрымаўшы 10 парконных плугоў, ВЫКАНАЛА ЯГО ЗА 5 ДЗЁН. Брыгада па ўзорваньні плошчы пад віку справілася са сваёй задачай НА 1 ДЗЁНЬ РАНЕЙ ТЭРМІНУ. Брыгада сьцяпроў СКОНЧЫЛА РАМОНТ КАЛЁС НА 8 ДЗЁН РАНЕЙ ВЫЗНАЧАНАГА ТЭРМІНУ.

КУЛАКІ І ПАДКУЛАЧНІКІ ЎСІМІ МЕРАМІ ІМКНУЦЦА САРВАЦЬ ПАСЬПЯХОВАЕ ЎКАРАНЕНЬНЕ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ. Клясавы вораг пачаў распускаць чуткі, нібы зьдзельшчына... губіць коняй, псуе інвэнтар. Кулацкія вылазкі, аднак, сустракаюць магутны адпор з боку калгасьнікаў, якія, перакананаўшыся на справе ў перавагах зьдзельшчыны, ажыцьцяўляюць не на справе, разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарництва.

Кулак імкнецца затрымаць сяўбу

ВУШАЧЫ.

Сяўба ідзе па ўсім раёне. Трактары працуюць бесьперабойна па ўсіх сельсаветах.

Неабходна, аднак, адзначыць, што рад прарываў не ліквідаваны да пачатку сяўбы. Так, 14 калгасаў яшча не пераведзены на зьдзельшчыну. Далёка ня ўсе калгасы замяляўпарадкаваны і маюць вытворчыя пляны. Раённы агранам складаў вытворчыя пляны па-габінэтна му, ня прыцягваючы да ўдзелу ў гэтай рабоце калгасьнікаў.

Яшчэ ня скончан і завоз с.-г. машын. Завезены плугі сматужнага вырабу, якія маюць вялізарную вагу. Працаваць такімі плугамі няма ніякай магчымасьці.

Кулацтва ўсімі мерамі імкнецца затрымаць калектывізацыю (ужо калектывізавана 30,8 проц. гаспадарак раёну (і разгортваньне сяўбы). Клясавы вораг ужывае рад шкодніцкіх выпадак аж да тэрарыстычных актаў. У Завячальскім сельсавеце суцэльная калектывізацыя і некаторых іншых сельсаветах кулак імкнецца затрымаць сяўбу ў калгасах шляхам падпалаў с.-г. машын і інш. сродкаў вытворчасьці.

Бядняцка-серадняцкія масы адказваюць на кулацкія вылазкі ўступленьнем у калгасы, а калгасьнікі—разгортваньнем ударнай работы на палёх.

С. Ч.

УСТАНАВІЦЬ ШТОДЗЕННЫЯ ПАСЕЎНЫЯ ЗАДАНЬНІ

Загадчыкам райза, старшыням калгассаюзаў, калгасаў і дырэктарам МТС

Веснавая сяўба разгарнулася ва ўсіх раёнах. Частка калгасаў паказала ўжо прыклады бальшавіцкіх тэмпаў выкананьня плянаў сяўбы (разгортваньне сацспаборніцтва, ударництва, сустрэчныя пляны, поўны пераход на зьдзельшчыну). Аднак, агульны ход сяўбы па калгасах усё яшчэ не забясьпечвае скончэньня сяўбы ў вызначаны тэрміны. Ёсьць пагроза, што частка калгасаў ня скончыць сяўбы ў тэрмін. Апрача гэтага пазіраюцца выпадкі, калі некаторыя калгасы парушаюць структуру пасеўных плошчаў, засяваючы замест тэхнічных і прапашных культур іншыя культуры.

Такое становішча тлумачыцца, галоўным чынам, тым, што ні райза, ні калгассаюзы і дырэктары МТС не забясьпечылі апэратыўнага кіраўніцтвам сяўбу ў калгасах і штодзённы нагляд за выкананьнем плянаў сяўбы.

Наркамзем і Калгасцэнтр абавязваюць загадчыкаў райза, старшынь калгассаюзаў, калгасаў і дырэктараў МТС:

1. Бесперапынна [illegible] МТС, выходзячы з агульнай [illegible] плошчы і тэрміну скончэньня сяўбы, пасеўнас аднаньне па плошчы на кожны дзень, забясьпечыць [illegible] выкананьне штодзённых [illegible], арганізаваць у раёне такім парадкам, каб райза, калгассаюзы і МТС [illegible] дзень, [illegible] ўлік ходу сяўбы ў раёне і калгасах.

жа прымаліся меры ўзмацненьня тэмпаў сяўбы там, дзе назіраецца аслабленьне або зрываецца плян.

2. Папярэджваем загадчыкаў райза, старшынь калгассаюзаў, калгасаў і дырэктароў МТС аб строгай адказнасьці за невыкананьне плянаў сяўбы тэхнічных культур, прапашных, гародніны і кармовых. Вызначаная структура пасеўных плошчаў па раёнах і калгасах абавязкова павінна быць выканана.

3. Канстатуем, што выхад у поле нэарыстарчальна выкарыстоўваецца для арганізацыі прыліву ў калгасы і што ініцыятыва перадавых калгасаў па выкананьні сустрэчных плянаў сяўбы, разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарництва невыстарчальна падхапляецца з боку раённых арганізацый. Прапануем прыняць усе меры па ўзмацненьні тэмпаў калектывізацыі, масавым разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарництва ў калгасах і перавыкананьні плянаў сяўбы на аснове сустрэчных плянаў, поўнага выкарыстаньня рабочай і цягавай сілы, поўнага пераводу ўсіх працэсаў работы на зьдзельшчыну і г. д.

4. Прапануем сваячасова і поўна інфармуючы аб ходзе сяўбы, разгортваньні сацспаборніцтва, ударництва, сустрэчных плянаў, прыліве ў калгасы, высьвятляць гэтыя пытаньні ў мясцовым і цэнтральным друку.

Наркамзем РАЧЫЦКІ.
Старшыня Калгасцэнтру БССР [illegible]

КАЛГАССЬСТЭМА ЗРЫВАЕ ЗАГАТОЎКІ АДКОРМЛЕНЫХ СЬВІНЕЙ

Прайшло больш двух месяцаў з моманту заключэньня дагавору паміж Белкалгасцэнтрам і Белмясам на здачу калгасамі ў 1931 г. 147.000 адкормленых сьвіней.

Паводле гэтага дагавору Белкалгасцэнтр абавязаўся да 15-га санавіка аформіць дагавары паміж асобнымі калгасамі і аддзяленьнямі Белмяса, прычым калгасы павінны былі здаць ужо на працягу першага квартану 20.000 сьвіней. На сёнешні дзень дагавары заключаны толькі па 5-8 раёнах, здана 187 штук замест 20-30 тыс.

Такое выкананьне дагавораў тлумачыцца тым, што Белкалгасцэнтр не стварыў вакол гэтага пытаньня грамадзкай думкі, не правёў ніякай работы сярод калгасьнікаў, нават не пакпапаціўся растлумачыць райкалгассаюзам, якую прадукцыю павінны здаваць калгасы; недарма многія райкалгассаюзы скардзяцца, што Белмяса не дае калгасам сьвіней для адкорму, забываючы, што калгасы павінны здаваць згодна дагавору сьвіней сваёй распрадукцыі.

На неаднаразовыя патрабаваньні Белмяса аб тым, каб прыняць меры да выкананьня дагавораў, работнікі Белкалгасцэнтру адказваюць, што зараз на раёне ёсьць шмат больш важнай, больш тэрміновай работы. Такія-ж адказы атрымліваюць ад райкалгассаюзу аддзяленьні Белмяса.

Такія настроі з боку работнікаў Калгасцэнтру і яго сыстэмы сьведчаць аб недаацэнцы дырэктыў партыі і ўраду наконт вырашэньня мясной праграмы і будаўніцтва спэцыялізаваных сьвінагадоўчых калгасаў.

У пачатку сакавіка «Зьвязда» заваструе гэта пытаньне. Калгасцэнтр як быццам заварушыўся, але праз некалькі дзён зноў заснуў, і ўся работа застаўся на мёртвым пункце. Зусім не аддалі ўвагі гэтаму пытаньню мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі.

Органы РСІ павінны зацікавіцца становішчам загатовак адкормленых сьвіней і патрабаваць ад калгасных сыстэмы поўнага выкананьня заданьняў, ня спыняючыся перад прыцягненьнем да адказнасьці вінаватых у зрыве дырэктыў вышэйшых органаў.

БЕЛКІНА.

Вапнаваньне на паперы

ДРЫБІНА. Вапняны завод, які ёсьць у Дрыбінскім раёне, да гэтага часу ўсё яшчэ застаецца бяспрытульным. Пастанова аб прыёмцы заводу Сампрамсаюзам яшчэ ня выканана. Рад работнікаў праяўляе апартуністычную недаацэнку ў справе вапнаваньня.

Сёлета ў веснавую кампанію павінна быць расьсеяна ў раёне 2.695 тон вапны. Калгасамі выпісана па ордэрах 1.900 тон, але вывезена з заводу толькі 400 тон. Такім чынам калгасы выпісваюць вапну толькі для «блізіру», але фактычна яе не бяруць.

Ніякай растлумачальнай работы па вапнаваньні не вядзецца.

Горацкі раён павінен быў вывезьці 1.209 тон, а забраў толькі 18 тон. Гэта сьведчыць аб тым, што і Горацкі раён ігнаруе вапнаваньне.

Неабходна, урэшце, пакончыць з апартуністычнай недаацэнкай такога важнага аграмерапрыемства, як вапнаваньне.

ПАШКЕВІЧ.

Ворыва скончана

ВУЛА. (Па тэлеграфу). Калгас «Камунар», Гарбачыцкага сельсавету, за апошнія часы вырас на 44 гаспадаркі і зараз яднае 105 бядняцка-серадняцкіх двароў, плошчу ў 801 гэкт. Ворыва скончана. Засеян гарох. Пачалася сяўба іншых яравых культур. Усе работы пераведзены на зьдзельшчыну. Калгас абвясьціў сябе ўдарным.

МІКУЦКІ.

Янаўскі польскі сельсавет калектывізаваны на 52 проц.

СЬВІСЛАЧ, 7.

У выніку растлумачальнай работы ў часе абгаварэньня закону пра с.-г. падатак на 1931 год у Янаўскім нацыянальным польскім сельсавеце разгарнуўся масавы прыліў у калгасы. За дэкаду ў калгасы ўступіла 28 гаспадарак. У в. Малінаўка арганізован новы калгас з 10 гаспадарак, у в. Забродзьдзе—новы калгас з 5 гаспадарак, у калгас «Ударнік» уступіла 5 гаспадарак, у калгас «Чырвоны шлях»—4 гаспадаркі і ў калгас «Кастрычнік»—4 гаспадаркі.

Янаўскі сельсавет па калектывізацыі ідзе першым у раёне. З 280 гаспадарак на дзень 1 мая ў калгасах знаходзіцца 148 гаспадарак, што складае 52 проц. усіх гаспадарак сельсавету.

Я. БУЛАТ.

НІ АДНАГО КАЛГАСУ І САУГАСУ БЯЗ СІЛАСУ

СЯЎБА СІЛАСНЫХ КУЛЬТУР—РАШАЮЧЫ ЭТАП БАРАЦЬБЫ ЗА КАРМЫ

Пачаць падрыхтоўку сіласаваньня

Зусім нязначны процант (8 проц.) выкананьня пляну сіласаваньня на БССР у мінулым годзе тлумачыцца недаацэнкай справы сіласаваньня кармоў паасобнымі зямельнымі органамі, якія лічылі гэту работу другарадным, зьмяншалі пляны сіласаваньня, не згуртавалі вакол сіласаваньня вясковага актыву. Не праводзіліся вытворчыя нарады па сіласаваньні ў саўгасах і калгасах. Будаўніцтва вежаў, ям і траншэй праводзілася зусім позна, перад самай закладкай сіласу, а ў некаторых выпадках вежы засталіся зусім не пабудаванымі.

Пры падрыхтоўцы і правядзеньні сіласнай кампаніі бягучага году неабходна самым рашучым чынам узяцца за зьнішчэньне леташніх перашкод у сіласаваньні, за поўнае выкананьне пляну сіласаваньня бягучага году.

1. Ужо зараз трэба загатовіць будаўнічыя матар'ялы па сіласных вежы, ямы і траншэі (камень, цэгалу, цэмэнт, дровы і інш.); 2) устанавіць—колькі павінен засіласаваць кожны саўгас, калгас, адкуль атрымаць зялёную масу (колькі ад спэцыяльна сіласных культур і інш. расьлін і ад адкідаў паляводзтва і гароднічтва); 3) арганізаваць курсы па падрыхтоўцы брыгадзіраў сіласаваньня для кіраўніцтва ударнымі брыгадамі па сіласаваньні. Курсы павінны быць арганізаваны з калгасьнікаў, рабочых саўгасаў, камсамольцаў і беспартыйнай моладзі; 4) выявіць колькасьць сіласарэзак і сячкарань, якія ёсьць у раёне, сельсавеце, калгасе, саўгасе, і скласьці каляндарны плян скарыстаньня гэтых машын, выходзячы з 2-3-зьменнай іх нагрузкі.

Ход падрыхтоўкі і правядзеньня сіласаваньня 1931 году павінен шырока асьвятляцца ў мясцовым друку шляхам сацспаборніцтва паміж паасобнымі саўгасамі, калгасамі за стварэньне моцнай кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Папярэдзім зрыў сіласаваньня на Лоеўшчыне

Чакаем адказу Белкалгасцэнтру

Лоеўскі раён зьяўляецца жывёлагадоўчым. Кантрольныя лічбы, вызначаныя Белкалгасцэнтрам па ўкамплектаваньні сацыялістычнага сэктару малочна-прадукцыйнай жывёлай, у асноўным выкананы. Аднак, пытаньне стварэньня кармовай базы зьяўляецца вузкім месцам у вырашэньні жывёлагадоўчай праблемы. Ня гледзячы на гэта, Белкалгасцэнтр у мінулым годзе паставіў пад удар 300 кароў малочнай фэрмы Дняпроўскай камуны. Вызначыўшы плянам пабудову сіласнай вежы на 300 тон, Белкалгасцэнтр разаслаў матар'ялы гэтай вежы ў іншыя раёны і паводаміў савет камуны аб тым, што абручы і іншыя прылады для пабудовы гэтай вежы раскінуты па іншых раёнах толькі ў той час, калі сілосныя культуры капчаткова загінулі і быў пакрыты сьнегам, толькі пасьля гэтага ён прыслаў свайго інжынэра і тэхніка на пабудову вежы.

У гэтым годзе, паводле пляну, у нашым раёне вызначана паводова 4-х вежаў і дана заданьне на 5.613 тон сілосу. Мы паставілі сваёй мэтай прыкласьці ўсе сілы на вырашэньня кармовай базы. Аднак, грунт глебы і наяўнасьць падглебных вод у нашым раёне не даюць магчымасьці будаваць траншэі і капаць сіласныя ямы. Таму чатырох вежаў для раёну жывёлагадоўчага напрамку бязумоўна мала. Аднак, Белкалгасцэнтр пасьля таго, як плян будаўніцтва быў абыяркован калгасамі, паведаміў райкалгассаюз, што для раёну намячаюцца не чатыры, а дзьве вежы.

Мы лічым, што такія адносіны да вырашэньня пытаньня кармовай базы і жывёлагадоўлі зьяўляецца ня інакш, як шкодніцтвам. Просім Белкалгасцэнтр адказаць, чым тлумачацца такія галавацяпскія пастановы і такое «плянаваньне».

М. Р.

СТВАРЫЦЬ КАРМОВУЮ БАЗУ

У калгасе «ЗГОДА», Каменскага сельсавету, Лепельскага раёну, у часе правядзеньня сіласнай кампаніі мінулага году вельмі недаверлива адносіліся да гэтай справы. Вельмі вялікіх труднасьцей каштавала партыйнай і камсамольскай ячэйкам, каб пераламаць гэты настрой і пачаць з усякіх аднідаў рабіць сілас.

Зусім іншае мы атрымалі зараз. Абедзьве ямы сілосу выйшлі вельмі добрыя. Пансэваўся верхні пласт усяго на 2 вяршкі. Калгас атрымаў каля 13 тон вельмі кештоўнага корму, каровы добра ядуць сілас, за гэты час павялічыўся ўдой малака. Дзякуючы сілосу мы выходзім да вясны са здавальняючым становішчам з кармамі. Зараз ужо сілас сам агітуе за сябе.

СІЛАС—ГАЛОЎНЫ ВАГАР У БАРАЦЬБЕ ЗА КАРМЫ

Перавага захоўваньня кармоў шляхам сіласаваньня, як у сэнсе меншай страты іх спажыўнасьці ў параўнаньні з вымушаньнем на сена, так і магчымасьці карміць жывёлу поўны год сакавітымі кармамі—пераконвае ў неабходнасьці ў сіласную кампанію бягучага году сіласаваць у значнай сваёй частцы ўсе кармы, прыгодныя для кармленьня жывёлы, а не абмяжоўвацца толькі спэцыяльна сіласнымі культурамі сланечніку і кукурузы.

Памянёныя культуры, якія ў сваім складзе маюць значную колькасьць цукру, вельмі добра сіласуюцца як пры гарачым, так і халодным спосабе сіласаваньня.

Посьпех іх сіласаваньня тлумачыцца тым, што ў выніку работы малочна-кіслых бактэрый цукар ператварэцца ў малочную кіслату, якая, накапляючыся ў корме, перасьцерагае яго ад далейшай зьмены і псаваньня. Наўдачы сіласаваньня сланечніку і кукурузы бываюць вельмі рэдкія і прытым тады, калі дапушчаны грубыя памылкі сіласаваньня.

У сувязі з тым, што некалькі іншы стаіць справа з сіласаваньнем расьлін бабовых, якія маюць у сабе мала цукру і многа бялку, які пры сіласаваньні не заўсёды добра кансэрвуецца, у некаторых саўгасах і калгасах адносяцца да сіласаваньня такіх расьлін, як канюшына, віка, гарох, сэрадэля, бабы і інш., неахвотна. Вось чаму бабовыя расьліны звычайна трэба сіласаваць з расьлінамі, якія маюць значную колькасьць цукру, напрыклад, сланечнік, кукуруза, авёс і інш. Але посьпех сіласаваньня бабовых расьлін залежыць ня толькі ад таго, што бялок дрэнна сіласуецца наогул, а ад таго, што як і заўсёды, а пры сіласаваньні бабовых расьлін у асаблівасьці патрэбна ўжываць халодны спосаб сіласаваньня.

У чым перавага халоднага спосабу сіласаваньня перад гарачым? Пры халодным сіласаваньні малочна-кіслае бушаваньне ці ператварэньне бактэрыямі цукру сіласаванага корму ў малочную кіслату праходзіць пры тэмпэратуры, якая не перавышае 20-25; такія чынам сіласаваная маса ўвесь час, пакуль у ёй праходзіць малочна-кіслае бушаваньне, застаецца халоднаю, а гэта дае магчымасьць атрымаць менш

ПА-БАЯВОМУ ЎЗЯЦЦА ЗА ЛЕСАСПЛАЎ

ЗЬНЕСЬЦІ БЮРАКРАТЫЧНЫЯ ЗАПРУДЫ ПА ШЛЯХУ ПЛЫТОЎ

Лесбел нічога не зрабіў для мэханізацыі сплаўных работ.—Белкаапсаюз ня выканаў абавязацельстваў па адкрыцьці сталовак і завозе тавараў.—Саюзлесдрэўрабочых ня кіруе сацспаборніцтвам на сплаве

Рэйд брыгад НКП на сплаве

Брыгады Наркампрацы БССР правералі падрыхтоўку да сплаву і навігацыі.

Брыгады абследавалі 5 устаноў — Лесбел, Наркампрацы, Белкаапсаюз, Наркамат Аховы Здароўя і Белдзяржснаб.

Сплаў не забясьпечан рабочай сілай

Брыгады выявілі, што сплаў не забясьпечан поўнасьцю рабочай сілай. Толькі па адной бабруйскай сплаўнай канторы не хапае 40 проц. патрэбнай колькасьці рабочых.

Лесбел дагэтуль не наладзіў работы на вярбоўцы плытагонаў. Ён ня мог даць дакладных вестак аб становішчы і ступені забясьпечанасьці сплаву рабсілай па 2-х сплаўных канторах.

Плянавы сэктар Наркампрацы прыняў ад Лесбелу неўгрунтаваную і неканкрэтную заяўку на рабсілу бяз усялякіх тлумачэньняў. Плян патрэбнасьці ў рабсіле быў распрацаваны нядобрасумленна. Мэханічна была вылічана патрэбнасьць (на падставе неправераных саюзнай нормы выпрацоўкі), ня былі ўлічаны ўмовы БССР. Таксама ня былі распрацаваны крыніцы, з якіх неабходна пакрыць патрэбу сплаву ў кваліфікаваных плытагонах.

Сэктар забясьпячэньня кадрамі Наркампрацы, ня гледзячы на сваячасовую падрыхтоўку да сплаву (правёў рад нарад і даў адпаведныя дырэктывы), плян забясьпячэньня сплаву рабочай сілай не давёў поўнасьцю да вёсак і калгасаў. Таму ня былі высунуты на мясцох сустрэчныя пляны.

У выніку рабсілу разьмеркавалі арыентовачна.

Вярбовачны апарат Лесбелу быў дрэнна ўкамплектован. Сэктар кадраў Наркампрацы не правяраў структуры і якаснага становішча вярбовачнага апарату Лесбелу.

Згодна пастановы СПА Лесбел прыняў захады для таго, каб дагавары са сплаўшчыкамі былі заключаны на некалькі рэйсаў з мэтай значнага вымяшэньня цякучасьці рабсілы і лепшага скарыстаньня прэміяльных фондаў. Але як гэта справа праводзіцца ў жыцьцё і колькі такіх дагавароў сплаўнымі канторамі заключана, Лесбел ня ведае.

Сацспаборніцтва на сплаве зусім слаба разгорнута. На сплаве працуе кала 20 тыс. сплаўшчыкаў, а арганізавана ўсяго... ва ўдарных брыгад.

Лесбел ня ведае становішча на мясцох

Такелажам сплаў забясьпечан поўнасьцю. Магчыма, што некаторая частка такелажу ня будзе поўнасьцю скарыстана. Таксама здавальняюча забясьпечаны плытагоны ліхтарамі. Ёсьць выпадкі, калі запараджаныя ліхтары адсылаюцца сплаўнымі канторамі назад.

Дрэнна забясьпечаны рабочыя сплаву інтэрнатамі. Да гэтага часу яшчэ не пабудаваны вызначаныя 6 дамоў. Паводле неправераных даных Лесбелу, ёсьць 12 інтэрнатаў апрача вызначаных для пабудовы, але-ж у якім яны становішчы, Лесбел ня ведае і ня цікавіцца ведаць.

Ні Лесбел, ні сэктар Наркампрацы па арганізацыі і аздараўленьні ўмоў работы ня могуць даць выразнага адказу, колькі асыгнавана грошай на кыльлёвае будаўніцтва на сплаве ў гэтым годзе, дзе і што будзе будавацца.

На буйных прыстанях павінны былі быць пабудаваны будкі для абслугоўваньня і абаграваньня плытагонаў, але да гэтага часу ня толькі невядома, ці пабудаваны гэтыя будкі, але і невядома нават, на якіх прыстанях яны будуюцца.

Былі выпадкі, калі Лесбел беспадстаўна затрымліваў рассылку калдагаваў мясцом. Сэктар арганізацыі і аздараўленьня ўмоў працы НКП прапанаваў Лесбелу выправіць гэтыя ненармальнасьці, але і да гэтага часу не праверыў, як выканана прапанова.

Мэханізацыя сплаву—па-за ўвагай

Амаль нічога не зрабіў Лесбел і па мэханізацыі сплаўных работ. Пастаянай работы і дасьледаў у гэтай галіне не праводзіцца. Абаданьня Саюзлесправам 4 лябёдкі і 4 маторныя лодкі да гэтага часу не атрыманы. Толькі за апошні час Лесбел пачаў рыхтаваць катэры і маторныя лодкі. Зараз будуецца 3 катэраў і 3 маторныя варпавальныя лодкі. На р. Бярэзіне працуюць адзін катэр і тры маторныя лодкі. У галіне мэханізацыі выгрузкі будуць прыстасаваны 8 трактараў.

Блытаніна і безадказнасьць у забясьпячэньні сплаву

Забясьпячэньне сплаву прамтаварамі, прадуктамі і фуражом нездавальняючае. Лесбел злачынна нядбайна адносіўся да складаньня заявак на прамтавары. Разнарадка на забясьпячэньне сплаву 1931 г. была складзена першы раз 18 сьнежня, у ёй паказаны 32 вучасткі; у другі раз, 24 лютага, Лесбел прыслаў разнарадку з зусім новымі каэфіцыентамі, у якой адзначаны ўжо 66 вучасткаў. За час з 18 сьнежня па 24 лютага Белкаапсаюз склаў разнарадку, паводле першага варыянту. Нават і ў другі раз з разнарадкі «выпалі» рад сплаўных раёнаў (Крычаўскі, Шклоўскі, Копысьскі, Грэскі, Касьцюковіцкі, Хоцімскі і Расьнянскі).

Толькі 8 сакавіка Лесбел успомніў, што ў Слуцку ня трэба арганізоўваць пункту забясьпячэньня з-за адсутнасьці сплаву і замест Слуцку даў разнарадку на Старобін, Любань, Азарычы. Лесбел таксама ня ведаў, што ў Чырвонаслабодзкім раёне ідзе сплаў і што туды трэба пасылаць прамтавары.

Трэба адзначыць, што ні Лесбел, ні Белкаапсаюз ня ведаюць сапраўднага становішча з забясьпячэньнем прадуктамі і прамтаварамі на мясцох, паколькі разьмеркаваньнямі фондамі распараджаюцца леспрамгасы. Лесбел, абмежаваўшыся распрацоўкай каэфіцыентаў разьмеркаваньня тавараў, не арганізаваў кантролю за ходам гэтай работы.

У часе самай напружанай работы па забясьпячэньні сплаву працаўнік Лесбелу, які займаўся гэтай справай, папоў у водпуск, а яго намесьнік нічога ня ведае. Невядома, якім раёнам і ў якой колькасьці трэба пасылаць хлеб; нарады на хлеб выдаюцца толькі пасьля запытаньня саміх раёнаў.

Белкаапсаюз сарваў арганізацыю сеткі сталовых на сплаве: замест 17 сталовых, ён адкрыў толькі 2. Між тым, з месц дадаткова паступілі патрабаваньні на адкрыцьцё яшчэ 66 сталовых і 12 чайных. Работнік Белкаапсаюзу, які займаецца справамі грамадзкага харчаваньня, ашукваў грамадзкасьць, паказваючы, што на сплаве адкрыты 17 сталовых. Гутарка ідзе аб сталоўках, адкрытых яшчэ ў мінулым годзе.

Белкаапсаюз ня ведае, ці функцыянуюць гэтыя сталоўкі зараз і як яны абслугоўваюць плытагонаў. Белкаапсаюз дагэтуль не арганізаваў належнай колькасьці пякарань, яны будуць пабудаваны не раней 15-га чэрвеня.

Аб ахове працы не клапоцяцца

Лесбел заключыў дагавары з НКАЗ БССР і УССР накшт мэдабслугоўваньня плытагонаў. НКАЗ БССР абмежаваўся рассылкай цыркуляраў і не зацікавіўся праверкай становішча на мясцох. НКАховы Здароўя Украіны несвячасова прыслаў абсталяваньне, у сувязі з чым было сарвана мэдабслугоўваньне часткі плытагонаў.

Дрэнна забясьпечаны рабочыя на сплаве гатавальнікамі, большая частка пунктаў іх зусім ня мае. Лесбел заяўляе, што ён «прыняў меры» да пасылкі гатавальнікаў, але чамусьці іх да сёнешняга дня на месцы няма.

Сплаўныя канторы атрымалі 70 проц. занараджаных ботаў для рабочых сплаву, але якасьць гэтых ботаў зусім незадавальняючая — гэта недамеркі, з кароткімі халявамі і г. д.

Белдзяржснаб праявіў фармальна бюракратычныя адносіны да забясьпячэньня плытагонаў спэцвопратай.

Няма плянавага ўліку патрэбы ў спэцвопратцы.

Культурна-масавае абслугоўваньне, за выключэньнем пасылкі радыё-ўстановак, праводзіцца шляхам... пісьмовых дырэктыў (Белкаапсаюз, саюз лесдрэўрабочых). Як сапраўды праводзіцца культабслугоўваньне — у Менску ня ведаюць. Інструктары па праверцы падрыхтоўкі да сплаву ня былі скарыстаны для інструктаваньня культработы.

Вывады абсьледаваньня — Лесбел і Белкаапсаюз ня ўжылі баявых тэмпаў у падрыхтоўцы да сплаву. У іх рабоце наглядаецца пэўная стаўка на самацёк, якая пагражае пасьпяховаму ходу сплаўных работ.



Ударная работа на сплаве

ЧАЧЭРСК. (НАШ КАР.). УЛІЧВАЮЧЫ СЬНЕЖНУЮ ЗІМУ Г. Г., ЧАЧЭРСКІ ЛЕСПРАМГАС ПАЧАЎ ЯШЧЭ НЕКАЛЬКІ МЕСЯЦАЎ НАЗАД ПАДРЫХТОЎКУ ДА СПЛАВУ. ДЗЯКУЮЧЫ ЎДАРНАЙ РАБОЦЕ ДЗЕСЯТНІКАЎ ЛЕСПРАМГАСУ, УДАЛОСЯ ВЫРАТАВАЦЬ АД ПАВОДКІ НЕКАЛЬКІ СОТЕНЬ ШПАЛЬНЫХ ЧУРБАНОЎ. У ЧАСЕ ПАВОДКІ НЯ ЗЬНЕСЕНА НІВОДНАГА БЕРВЯНА, БО ЯШЧЭ ЗА 10 ДЗЁН ДА ПАЧАТКУ ЎЗДЫМУ ВАДЫ ЎСЕ ПРЫСТАНІ БЫЛІ АГЛЕДЖАНЫ СПЭЦЫЯЛЬНАЙ КАМІСІЯЙ І ЎМАЦАВАНЫ.

УЖО 29 КРАСАВІКА ПУШЧАНЫ ТРЫ КАРАВАНЫ ЗЛІСАМ НА ТОМЕЛЬ. ДА 10 МАЯ БУДУЦЬ НАКАРАВАНЫ ЯШЧЭ 4 КАРАВАНЫ. РАБОЧЫЯ - ПЛЫТАГОНЫ Б. ПЛАНТАВІЧЫ І ЗАЛЕСЬСЬІ Ў КОЛЬКАСЬЦІ 140 ЧАЛ. ПА-ЎДАРНАМУ ПРАЦАВАЛІ НА СПЛАВЕ.

ЛЕСПРАМГАС І СПЛАЎКАНТОРА ПАВІННЫ ПРАМІЯВАЦЬ ЎДАРНІКАЎ ПЛЫТАГОНАЎ.

С.

Сплаў і „Дзень лесу"

Адзін з вялікіх выдаткаў па транспартаваньні дрэўніны па водных шляхох — гэта ўрэгуляваньне ўзроўню вады на рэках, бо ад яго залежыць пасьпяховае правядзеньне сплаву.

У дарэвалюцыйны час уласьнікі лясных дач зусім не аддавалі ўвагі ўрэгуляваньню ўзроўню вады, яны драпежніцкі высякалі бліжэйшыя да ракі лясныя дачы, клапоцячыся толькі аб прыбытках. У выніку мы маем зусім аголеныя рэчкі, надзвычайныя паводкі ў веснавы перыяд і вялікае мелкаводзьдзе ўлетку.

50-ае год назад летам па р. Бярэзіне праходзілі глыбока-сядзячыя судны, а ў мінулым годзе ў чэрвені ўзровень вады ўпаўзся 35 см., параходны рух быў спынен, сплаў затрымаўся.

На выплавачных рэках там, дзе няма запруд, вада амаль адсутнічала.

Вясной г. г. у сувязі з нябывалай паводкай зьнесена каля 90 проц. запруд. Сплаў драўніны зьвязан з надзвычайнымі труднасьцямі, не гаворачы ўжо аб мелкаводзьдзі ў сярэдзіне лета.

Таму з паводкай і летнім абмяленьнем рэк трэба весьці самую сур'ёзную барацьбу. Тут вялікую ролю адыгрывае аблясеньне нашых аголеных рэчак. Да гэтай справы павінна быць прыкавана ўвага ўсіх мясцовых арганізацый. Сельскія камсамольскія ячэйкі павінны быць арганізатарамі «Дня лесу» ў мэтах аблясеньня водных артарый.

Лесанасаджэньні на берагах рэгулююць узровень вады, бо сапраўды растаўваньне сьнегу і перашкаджаюць мелкаводзьдзю.

Кошалеў.

Фармалізм і бязьдзейнасьць

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). У мэтах максымальнага ўдзелу грамадзкасьці ў мабілізацыі сродкаў насельніцтва, ЦП саюзаў савецкіх і гандлёвых служачых, працаўсьветы і сельгасрабочых заключылі з кіраўніцтвам ашчадкасамі БССР сацдагавор на ўцягненьне ўкладаў праз ашчадкасы.

Як прафарганізацыі Барысаўшчыны сустрэлі гэта важнае палітычнае мерапрыемства? Яны аднесьліся да выкананьня сацдагавору фармальна, недаацэніўшы значэньня мабілізацыі сродкаў.

Райпрафсавет ня прыняў мер, каб забясьпечыць выкананьне дагавароў.

У выніку дрэнная кіраўніцтва фабзаўкомы буйнейшых прадпрыемстваў не прынялі ўдзелу ў мабілізацыі сродкаў.

Цікава адзначыць, што ў сваёй пастанове аб выніках выкананьня дагавароў на ўцягненьне ўкладаў райпрафсавет абыйшоў моўчкі пытаньне аб адносінах прафарганізацый да сацдагавароў і ўсю адказнасьць усклаў на ашчадкасу, якая, быццам, падышла фармальна да гэтай справы.

Замазваньне недахопаў у рабоце прафарганізацый па мабілізацыі сродкаў сьведчыць аб апартуністычнай недаацэнцы фінансавай работы з боку прафсаюзных арганізацый Барысава.

З. Р.

Сродкі працоўных—на фінансаваньне сацыялістычнай будоўлі

АГУЛЬНЫ СХОД РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ САЎГАСУ ІМЯ АНЦЦЛОВІЧА АДНАГАЛОСНА ПАСТАНАВІЎ ДА ТЭРМІНУ ВЫПЛАЦІЦЬ УЗНОСЫ НА ПАЗЫКУ «ПЯЦІГОДКА—ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ» І ЎСІМ КАЛЕКТЫВАМ УСТУПІЦЬ ВА ЎКЛАДЧЫКІ АШЧАДКАСЫ.

В. КІСЕЛЬ.

**

КАЛЕКТЫЎ РАБОЧЫХ БАБЫНІЦКАЙ КРАВЕЦКАЙ АРТЫЛІ ЧЫРВОНЫ ПАГРАНІЧНІК, У МЭТАХ ПАСЬПЯХОВАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ БУДАЎНІЦТВА МТС У ВЕТРЫНСКІМ РАЁНЕ, ПАДПІСАЎСЯ НА АКЦЫІ ТРАКТАРАЦЭНТРУ НА СУМУ 550 РУБ.

П.

Барацьба за фінплян—неадлучная частка барацьбы за пяцігодку за чатыры гады

Шырокай масавай работай вакол фінпляну

забясьпечым бесьперабойнае фінансаваньне пабудовы „518" і „1040"

Ліквідаваць апартуністычную недаацэнку фінансавай работы.—Ударыць па тэорыі „чарговасьці кампаній"

Сыгналы з раёнаў

(Паводле лістоў рабселькораў)

Першы месяц другога кварталу, які павінен быў даць рашучы пералом у мабілізацыі сродкаў, не скарыстаны на мясцох для ліквідацыі прарываў у выкананьні фінпляну.

Паводле паведамленьняў рабселькораў з месц, у радзе раёнаў прарывы ў мабілізацыі сродкаў ня толькі не ліквідаваны, але, наадварот, пагыбіліся.

Тав. М—і паведамляе з ЖЛОБІНСКАГА раёну, што нават абавязковыя плацяжы не спагнаны, што за кулацкімі гасцяжы не спагнаны, што за кулацкімі гасцяжы падаркамі лічыцца вялікая нядоімка: заданьне па зборы страхоўкі выканана на 93 проц., па адказовым зборы — на 80 проц., кулацкія гаспадаркі здалі толькі 5 проц. заданьня па адказовым зборы, 16 проц. — па самаабкладаньні. Раённыя арганізацыі ня прымаюць мер, каб спагнаць запазычанасьць з кулацка-заможных элемэнтаў.

Тав. С. К. з ДРЫСЕНСКАГА раёну адзначае, што мясцовае аддзяленьне Дзяржбанку мала аддае ўвагі мабілізацыі сродкаў і ня выконвае заданьняў. Пратэрмінаваных пазык па адказовым сэктары лічыцца на 24.000 руб. За першы квартал трэба было рэалізаваць акцый Трактарацэнтру на 13.500 руб., сабрана 810 руб.

Тав. ЧЫРВОНЫ з БЯЛЫНІЦКАГА раёну спыняцца на рабоце РАЙКАЛГАССАЮЗУ ў галіне мабілізацыі сродкаў. Райкалгасаюз не праводзіць ніякай растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў. Многія калгасьнікі ня ведаюць, для чаго рэалізуюцца акцыі Трактарацэнтру, у якіх мэтах зьбіраюцца ўступныя ўзносы. Заданьне першага кварталу па ўступных узносах выканана толькі на 67 проц. Праўда, была праведзена нарада старшынь райкалгассаюзаў, на якой стаяла пытаньне аб ходзе мабілізацыі сродкаў, але да гэтага пытаньня аднесьліся чыста фармальна. Ні адзін з старшынь калгасаў не палічыў патрэбным спыніцца на мабілізацыі сродкаў па калгассыстэме.

Тав. Я. ЖЫЛКА са СЛУЦКУ сыгналізуе аб прарывах у рабоце мясцовай ашчадкасы. Замест прыліву сродкаў, назіраецца адліў, што зусім недапушчальна. Прарывы, — заўляе тав. Жылка, — гэта вынік апартуністычнай стаўкі на самацёк. Камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту зусім бязьдзейнічаюць і не дапамагаюць рабоце ашчадкасы. У сувязі з дрэннай работай вясковых камісій садзейнасьці, рэалізавана аблігацый пазыкі «Пяцігодка» толькі на 45 проц. Ні адна камісія садзейнасьці ня ўключылася ў конкурс-спаборніцтва на лепшую работу камсадаў.

Тав. ЖУКАЎ у сваёй заметцы адзначае, што многія нізавыя прафарганізацыі лічаць ашчадсправу «другараднай» справай. Напрыклад, загадчык ашчадкасы № 297 зьвярнуўся да нам, старшыні фабкому Віцебскай швейнай фабрыкі «Шлях індустрыялізацыі» тав. Шульчыка з просьбай паставіць на пасяджэньні ФЗК пытаньне аб рабоце ашчадкасы. Тав. Шульчык адказаў: «Гэта пытаньне не на столькі важнае, мы ім займемся ў больш вольны час».

Усе гэтыя факты сыгналізуюць аб поўнай пагрозе выкананьня фінпляну другога кварталу. Нельга дапусьціць, каб з-за апартуністычных адносін да фінансавай работы стварыліся перабоі ў фінансаваньні народнай гаспадаркі.

Па зрыўшчыках фінпляну трэба моцна ўдарыць, каб прымусіць іх усьвядоміць вялізарнае значэньне мабілізацыі сродкаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

С.

За падрыў дзяржкрэдыту—да адказнасьці

Адміністраваньне—замест масавай работы

Побач з масава-растлумачальнай работай вакол пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады», побач з шырокімі агітацыйнымі мерапрыемствамі для ўцягненьня ў рэалізацыю новых мас рабочых, служачых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў, павінны быць прыняты самыя рашучыя рэпрэсыўныя меры да тых устаноў і арганізацый, да тых работнікаў, якія злачынна-нядбайнымі адносінамі да рэалізацыі пазыкі зрываюць выкананьне плянаў мабілізацыі сродкаў.

Як назваць, напрыклад, такі факт, які меў месца ў Крычаўскім раёне. Да моманту тыражу сельсаветы не здалі Дзяржбанку грошай пазыкі ў разьмеры 2.450 р.; ёсьць выпадкі, калі сельсаветы ня ведаюць, дзе знаходзяцца аблігацыі, якія ім даны для рэалізацыі за наяўны разьлік. Райфа ня прыняў ніякіх мер, каб прымусіць сельсаветы здаць грошы, каб расьсьледаваць, ці няма тут растраты. Калі загадчык райашчадкасы падаў запіску аб гэтым прэзыдыуму РВК, апошні вынес пастанову: «Паколькі пытаньне ня мае ніякага значэньня, зьняць яго з парадку дня».

Другі факт, як некаторыя сельсаветы рэалізуюць аблігацыі пазыкі. Замест таго, каб разгарнуць масавую работу, каб растлумачыць сялянству значэньне дзяржкрэдыту, яны ідуць па лініі найменшага супраціўленьня, адміністрацыйным парадкам навязваючы аблігацыі.

Прэзыдыум Жгунскага сельсавету, Гомельскага раёну разаслаў сялянам наступныя паведамленьні: «Паводле пастановы прэзыдыуму, вы павінны ўнесьці ў касу сельсавету ў ліх пазыкі «Пяцігодка»... руб.» Такімі мэтадамі рэалізацыі можна толькі падарваць давер'е сялянства да дзяржкрэдыту. Замена масавай работы адміністраваньнем зьяўляецца злачынным парушэньнем дыэктыў партыі.

М.

МЕНСК

Усеагульнае абавязковае навучаньне ў БССР

Калегія Наркамасьветы зацьвердзіла мерапрыемствы па ўсеагульным абавязковым навучаньні на 1931-32 навучальны год.

Абавязковым навучаньнем у першым канцэнтры працоўнай палітэхнічнай школай будуць ахоплены ўсе дзеці ад 8 да 11 год.

З 1 кастрычніка 1931 г. у БССР будуць адкрыты 1.470 новых школьных камплектаў, што павялічвае агульны лік школьных камплектаў да 14.402. Колькасьць вучняў першага канцэнтру павялічыцца з 575.000 да 648.000.

Абавязковым навучаньнем будуць таксама ахоплены ўсе няпісьменныя і малапісьменныя падросткі ад 11 да 15 год. Да 1-га кастрычніка 1932 году будуць адкрыты 413 новых школ для падростваў, што павялічвае агульны лік школ для падростаў да 829.

У наступным навучальным годзе пашыраецца сетка школ 2-га канцэнтру.

З 1-га кастрычніка 1931 г. будуць адкрыты 670 новых груп 2-га канцэнтру, што павялічвае колькасьць груп да 2.490.

„День лесу" ў менскіх школах

10 мая ў «Дзень лесу» ўсе вучні 2-га канцэнтру менскіх школ прынялі ўдзел у пасадцы дрэў. Пад кіраўніцтвам лесаводаў вучнямі засаджана дрэвамі вялікая плошча.

Кіраўніцтва дэпутацкімі групамі

Прэзыдыум Менгарсавету зацьвердзіў 25 грамадзкіх па-заштатных інструктароў для кіраўніцтва работай дэпутацкіх груп на прадпрыемствах.

Падрыхтоўка да прызыву

Прызыў грамадзян, якія нарадзіліся ў 1909 г., будзе ў гэтым годзе праходзіць ва ўмовах абостранай клясавай барацьбы і павышаных запатрабаваньняў да прызыўнікоў, у сувязі з аснашчэньнем Чырвонай арміі тэхнікай. Асноўная задача падрыхтоўкі работы да прызыву—поўнасьцю выявіць і не дапусьціць у Чырвоную армію клясавачужых і сацыяльна-небясьпечных элемэнтаў, поўнасьцю ліквідаваць няпісьменнасьць і малапісьменнасьць сярод прызыўнікоў.

Для правядзеньня падрыхтоўчай работы і выяўленьня клясава-чужых элемэнтаў гарсавет выслухаў гарадзкую камісію ў складзе члена прэзыдыуму гарсавету т. Янковіча (старшыні і прадстаўнікоў гаркому КП(б)Б, гаркому ЛКСМВ, гарпрафсавету, райваенкамату і інш.

Пры сельсаветах прыгараднага раёну камісіі складаюцца са старшыні сельсавету і прадстаўнікоў сельскіх партыйных, камсамольскіх ячэек, калгасаў і беднаты.

У парадку сацыялістычнага сумяшчэньня

Прэзыдыум Менгарсавету ўстанавіў каля 30 адказных пасад, якія будуць заняты рабочымі-ўдарнікамі ў парадку сацыялістычнага сумяшчэньня (загадчык гарэа, старшыня гарпляну, загадчык камгасу, інспэктар асьветы, загадчык ашчадкасы).

На правядзеньне выбараў будуць вылучаны члены гарсавету—рабочыя-ўдарнікі ад варштату. Кандыдатуры вылучаных будуць загадзя абгавораны на рабочых сходах.

На дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня

Па ўсёй БССР разгарнулася шырокая кампанія дапамогі пацярпеўшым ад зямлятрасеньня ў Савецкай Арменіі і Нахічавані. Працоўныя Савецкай Беларусі паказваюць бліскучыя прыклады клясавай салідарнасьці, дапамагаючы пацярпеўшым братом з Савецкага Закаўказьля.

**

БАБРУЙСКІ КАМІТЭТ ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ перавёў у фонд дапамогі пацярпеўшым 1.000 руб.

**

КАЛЕКТЫЎ ПАРЫЦКАГА РАЙКААПСАЮЗУ ўнёс у банк 33 руб. і выклікаў на спаборніцтва па дапамозе пацярпеўшым усе калектывы ўстаноў м. Парычы.

**

РАБОТНІКІ ФІНАНСАВА-БАНКАЎСКІХ УСТАНОЎ КОПЫСКАГА РАЁНУ ўнесьлі ў фонд дапамогі 50 проц. аднадзеннага заработку ў суме 42 руб. і выклікалі пасьледаваць іх прыкладу ўсіх фінансава-банкаўскіх работнікаў БССР.

**

МЕНСКАЯ ДОБРААХВОТНАЯ ПАЖАРНАЯ ДРУЖЫНА ўкесла ў фонд дапамогі пацярпеўшым ад зямлятрасеньня 50 руб. і выклікала ўсе добраахвотныя пажарныя дружыны.

**

КАМСАД 4-АЙ ШКОЛЫ ФЗУ унёс у фонд дапамогі 50 руб. і выклікаў усе камісіі садзейнасьці школ г. Менску.

**

Ячэйка Чырвонага Крыжу Менскага ВАЕННАГА ШПІТАЛЮ сабрала па падпісным лісьце 83 руб.

У палоне самацёку

ГАРАДОК. (Наш кар.). Брыгады РКК-РСІ абсьледвалі выкананьне фінпляну ўстановамі ГАРАДОЦКАГА раёну. Фінплян за першы квартал ажыцьцёўлен толькі на 60 проц. Заданьне на красавік ня выканана (26,7 проц.), што пагражае ажыцьцяўленьню раённага фінпляну. Асабліва адстаюць ашчадкасы, якія не перабудавалі сваёй работы ў мэтах найбольшага ўцягненьня вольных сродкаў насельніцтва. Плян уцягненьня ўкладаў па вясковым сэктары выканан толькі на 24,5 проц., плян рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады»—на 40,8 проц., заданьне па пашырэньні акцый Трактарацэнтру—на 6,4 проц.

Фінансава-банкаўскі апарат Гарадоцкага раёну ня справіўся са сваімі задачамі. Замест таго, каб перабудаваць работу, на базе масава-растлумачальнай працы сярод насельніцтва, замест таго, каб акружыць фінансавую работу ўвагай шырокіх мас, фінансавы апарат працаваў па лініі найменшага супраціўленьня, займаючыся, галоўным чынам, спагнаньнем абавязковых плацяжоў.

Райкаапсаюз амаль нічога не зрабіў у адносінах мабілізацыі сродкаў. Устаноўлена, што па сетцы канапляводчай каапэрацыі невядома куды зьнікні 11 тыс. руб. За работнікамі лічыцца аванс у 1.500 руб. Меры да спагнаньня грошай, да аддачы пад суд вінаватых у растратах ня прыняты.

Спажывецкая каапэрацыя ўвесь час ня выконвала плянаў паянакапленьня і заўсёды перавышала ліміты. Плянавая астача тавараў была перавышана ў тры разы, рэалізавана тавараў значна менш, чым меркавалася плянам (на 300 тыс. замест 400 тыс. руб.). Дзяржбанк закрыў райсаюзу ліміты, тады кіраўніцтва спажывецкай каапэрацыі; замест мабілізацыі сродкаў, затрымала выручку—каля 6.000 руб.—і выдала яе ў якасьці пэнсіі сваім работнікам.

У сваіх вывадах брыгады РКК-РСІ канстатуюць, што ПРАФАРГАНІЗАЦЫІ ЗУСІМ БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЮЦЬ, ШТО ФІНАНСАВА-БАНКАЎСКІ АПАРАТ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ПАЛОНЕ САМАЦЁКУ, ШТО АПАРТУНІСТЫЧНАЯ НЕДАЦЭНКА ФІНАНСАВАЙ РАБОТЫ ЗРЫВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ВАЖНЕЙШЫХ ЗАДАНЬНЯЎ.

ШАРУБА.

Разгортваньне сеткі бытавых устаноў у саўгасах і калгасах

Прэзыдыум ЦВК БССР абмеркаваў пытаньне аб бытавым абслугоўваньні саўгасьніц і калгасьніц. Прэзыдыум вызначыў рад мерапрыемстваў па паляпшэньні гэтай справы.

Адзначыўшы неабходнасьць значнага пашырэньня сеткі дзіцячых устаноў, прэзыдыум даручыў раённым выканаўчым камітэтам і сельскім саветам, а таксама праўленьням калгасаў разгарнуць шырокую масавую работу вакол арганізацыі бытавых устаноў у саўгасах, калгасах і для аднаасобнікаў за кошт сродкаў самога насельніцтва калгасаў, мясцовых грамадзкіх арганізацый, з прыцягненьнем бытавых сэкцый сельскіх саветаў, культурна-бытавых камісій калгасаў, делегацкіх сходаў і г. д.

Райвыканкомы, сельскія саветы і праўленьні калгасаў павінны забясьпечыць сваячасовае разгортваньне сеткі ясляй і дашкольных устаноў і бесьперабойную работу іх шляхам адводу ім памяшканьняў, выдачы апалу, інвэнтару, сваячасовага фінансаваньня, поўнага скарыстаньня бытавых фондаў.

Для практычнага кіраўніцтва бытавымі ўстановамі, да апошніх павінны прымацоўвацца члены прэзыдыумаў сельскіх саветаў. Райвыканкомы на сваіх пленумах павінны заслухоўваць справаздачы райаддзелаў аховы здароўя і райінспэктуры асьветы аб рабоце бытавых устаноў, зварачаючы асаблівую ўвагу на медычны нагляд у дзіцячых установах.

У першую чаргу сетка дзіцячых устаноў павінна быць разгорнута ва ўдарных і спэцыялізаваных саўгасах і калгасах, у сельскіх саветах з найбольшым процантам калектылізацыі і ў пацыячых устаноў трэба разгарнуць да часу масавых палявых работ па пасеўнай і ўборачнай кампаніях.

Для набліжэньня аднаасобніц да калгасаў у калгасных яслях і дашкольных установах трэба забясьпечыць месцы для дзяцей аднаасобніц-бяднячак наўкольных вёсак.

Наркамснабу і Белкаапсаюзу прапанавана ўключыць сетку ясляй і дашкольных устаноў у плянавае забясьпячэньне.

Раённым бытавым камітэтам прапанавана склікаць нарады кіраўнікоў бытавых сэкцый сельскіх саветаў і культурна-бытавых камісій калгасаў для абгаварэньня плянаў пашырэньня ясельнай сеткі ў раёне, пытаньняў максымальнага пашырэньня сеткі бытавых устаноў за кошт мабілізацыі сродкаў насельніцтва і грамадзкіх арганізацый.

Паведамленьні

— Культпроп гаркому КП(б)Б 12 мая ў 6 гадз. веч. склікае нараду прыгарінспэктуры ў памяшканьні пэдгабінэту (ніяц Волі, будынак гарсавету). На нараду павінны зьявіцца ў абавязковым парадку культсэктары партканцтываў і ячэек.

— 13-га мая ў 7 гадз. веч. у памяшк. Гаркому адбудзецца нарада рэдактароў шматтыражак і насьценгазэт наступных прадпрыемстваў: «Камунар», «Энэргія», «Ударнік», «Бальшавік», абутковая ф-ка, чыгунка, Эльвод, друкарня імя Сталіна, Менбуд, Дзяржбуд, завод «Дрэваапрацоўшчык», пчотачная ф-ка, шчацінная ф-ка, ф-ка рымароў, скарняжная ф-ка, ф-ка імя Крупскай, 8-га сакавіка, хэмфармазавод, шклозавод, «Чырвоны хэмік». Яўка ў парадку партдысцыпліны абавязкова.

12-га мая ў 7 гадз. веч. у памяшканьні Дому Чырвонай арміі склікаецца пленум гарсавету Асоавіяхіму сумесна з асоавіяхімаўскім актывам. Парадак дня: 1) Аб лягерах Асоавіяхіму. 2) Аб самаабкладаньні. 3) Аб рабкораўскім руху. 4) Мастацкая частка. Уваход па асоавіяхімаўскіх білетах.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Беларускі Другі Дзяржаўны Тэатр
12 МАЯ паказ для саюзу камунальнікаў. Пач. у 8 гадз.
І. Гурскі КАЧАГАРЫ п'еса ў 4 дзеях.

Чырв. Зорка Пач. 7, 8-45 і 10-30 — новы амэрыканскі прыгодніцкі фільм У АПОШНЮЮ ХВІЛІНУ (Плыві, дзяўчына плыві)
„Культура" — З 10-V РЭВАНШ Звыш праграмы хроніка № 20.
„Інтэрнацыянал" — З 5 мая заможны фільм ШЛЮБ аб ЗАКЛАД Пач. 1 с. у 6 г. Каса—з 4 г. 30 м.
„Пралетары" — МОНСІ БЭНКС у камэдыі Гоншчык супроць волі
„Юны Піянэр" Пач з 1 г. дня. — З 6 МАЯ ўсходні фільм А-ЛІМ Кіно-аповесьць у 7 частках.
„СПАРТАК", Пач. 7, 8-45 і 10-30 Касы—з 5 гадз. — З 11-га мая выдатны фільм ПРАСТЫТУТКА Драма ў 7 частках.

Сёньня, у 7 гадз. веч., у памяшк. клюбу харчавіку АДБУДЗЕЦЦА
ЗЬЛЁТ КУЛЬТПРАЦАЎНІКОЎ
ФЗМК, КЛЮБАЎ і БІБЛІЯТЭК
па пытаньні ўсесаюзнага агляду нац. работы.
На зьлёце выступаюць з рапартамі прадпрыемствы „Кастрычнік", „Энэргія", клюбы: мэтазістаў, будаўнікоў, санатэмнікаў, яўрэйскі і польскі рабочыя клюбы. Менскае гарадзкое бібліятэка, Радыёцэнтр і Калгасцэнтр. Пасьля зьлёту адбудзецца мастацкая частка, арганізаваная Радыёцэнтрам.
ЦП саюзаў і ФЗМК неабходна прасачыць за сваячасовай яўкай.
Культсэктар ЦСПСБ. Нац. Камісія Гарсавету.

СПЕРМОКРИН ЭКСФРАКТ СЕМЕННЫЙ ЖЕЛЕЗЫ ИСПЫТАН КЛИНИЧЕСКИ
ДЗЯРЖ. ІНСТЫТУТ ЭКСПЭРЫМЭНТАЛЬНАЙ ЭНДАКРЫНАЛЁГІІ НАРКАМ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ
Даведкі і паказаньні да ўжываньня высылаюцца па першым запатрабаваньні друкмова.
Цана 1 фляк. 30 гр.—1 р. 50 к. „ 1 фляк. 50 гр.—2 р